

БЕЛАРУСКІ “ФЕНІКС” НА ЧАРНАМОРСКІМ УЗБЯРЭЖЖЫ

ЧЫРВОНКА

АБ ЧЫМ ПІСАЛІ ЯКУБУ КОЛАСУ БЕЛАРУСКІЯ ЛІТАРАТАРЫ 12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

3 ЛІСТАПАДА 2022 г. ЧАЦВЕР № 216 (29838)

**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Андрэй ІВАНЕЦ, міністр адукацыі:**

*«Штогод сістэма прафесійна-тэхнічнай адукацыі выпускае каля 25 тысяч ужо гатовых маладых спецыялістаў. Відавочна, што пры занятасці на рабочых прафесіях 1,5 млн чалавек у нашай краіне такой колькасці выпускнікоў недастаткова. Якія стратэгіі неабходна выпрацоўваць для вырашэння гэтай праблемы? У першую чаргу мы павінны звяртаць увагу не толькі на маладых спецыялістаў і моладзь як, безумоўна, асноўны інавацыйны рэсурс, што павінен прыходзіць на нашыя прадпрыемствы, але і на тых людзей, якія сёння занятыя ў эканоміцы, якім, магчыма, неабходна прайсці перападрыхтоўку і атрымаць новую прафесію. Сёння сістэма адукацыі сумесна з Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны прапануе правесці за кошт сродкаў бюджэту перападрыхтоўку па запатрабаваных на рынку працы прафесіях для таго, каб людзі сярэдняга, сталага ўзросту маглі знайсці сваю прафесію, рабочае месца і дастойную заработную плату».*

# САМЫЯ ВАЖНЫЯ НАВАСЁЛЫ

У Партызанскім раёне сталіцы адбылося адкрыццё абноўленага дзіцячага садка № 242. У цырымоніі адкрыцця прыняў удзел намеснік прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка.





Фота БелТА.



**КОРАТКА**

• **У Навапалацку на сустрэчы кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Ігара Сергеенкі і прадстаўнікоў сілавога блока краіны з актывам горада і членамі працоўнага калектыву ААТ «Нафтан» абмеркавалі грамадска-палітычную абстаноўку і эканамічную сітуацыю ў Беларусі і за мяжой.**

• Сезон палявання на пушных жывёл адкрываецца ў Беларусі 5 лістапада.

ISSN 1990 — 763X

Агульны дом — Беларусь

## «МЫ ЎЖО БРАСТАЎЧАНЕ»

**Шматдзетная маці са Славянска Данецкай вобласці і трое яе дзяцей атрымалі грамадзянства нашай краіны**



**Святлане часта сніцца родны горад, дом, у якім вырасла, у якім з'явіліся пазней і яе дзеці. Наогул дзеі любых сноў, самых неверагодных і нечаканых, разгортваюцца там, што і не дзіва. Там прайшлі найлепшыя гады, там была шчаслівая, там перажывала страты, няўдачы, роспач — тое, з чаго складаецца чалавечае жыццё. Раней і не задумвалася асабліва, як любіла гэты дом, пабудаваны некалі бацькамі.**

СТАР. 13

Актуальна

## Маёмасныя падаткі

**Раз у год іх плаціць кожная трэцяя сям'я**

**Праз два тыдні заканчваецца тэрмін аплаты маёмасных падаткаў. Да гэтай даты ўсім нам трэба разлічыцца па транспартным падатку, зямельным падатку і падатку на нерухомасць. Начальнік Галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Андрэй КАВАЛЕЎСКІ адзначыў, што папярэдне інспекцыі накіравалі 3 мільёны 400 тысяч паведамленняў на аплату гэтых падаткаў. Спецыялісты падлічылі, што гэтым разам падаткамі абкладаецца каля 6 мільёнаў аб'ектаў нерухомай і рухомай маёмасці. Тут і транспартныя сродкі, і маёмасць (машыны, гаражы, дамы, кватэры, дачы), а таксама зямельныя ўчасткі, якія належаць нашым грамадзянам. Такія падаткі сёлета «прыйшлі» ў дом кожнаму трэцяму жыхару краіны.**

### Палова маёмасных падаткаў ужо аплачана

Прадстаўнік міністэрства нагадаў, што да сярэдзіны лістапада трэба даплаціць транспартны падатак за 2021 год і зрабіць авансавы плацеж па падатку на нерухомасць і зямельны падатак за 2022 год. Канчатковая аплата двух гэтых маёмасных падаткаў будзе правадзіцца ўжо ў лістападзе 2023 года.

Спецыяліст адзначыў, што сёлета дзейнічае навацыя — уведзена адзінае паведамленне на аплату трох відаў падаткаў: зямельнага, транспартнага і падатку на нерухомасць. Гэта вельмі зручна для плацельшчыкаў, бо зведзены разам усе аб'екты падаткаабкладання, якія знаходзяцца ў іх ва ўласнасці, відаць агульную суму, можна расплачацца бюджэт, здзяйсняць плацяжы паэтапна. Галоўнае — паспець заплаціць падаткі да 15 лістапада.

СТАР. 3

Парламенцкі дзённік

# Каб людзям жылося камфортна



Фота БелТА.

**У рэгіёнах павінны быць створаны ўсе ўмовы для камфортнага жыцця людзей. Акцэнт на гэтым зрабіла Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА на выязным пасяджэнні Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі, якое прайшло ў Петрыкаўскім раёне.**

Узаемадзеянне з мясцовымі органамі самакіравання — адзін з найбольш важных кірункаў работы Савета Рэспублікі, адзначыла Наталля Качанава. «Правядзенне падобных мерапрыемстваў, як правіла, плануем на выездзе, — заўважыла яна. — Гэта дазваляе лепш азнаёміцца з рэгіёнамі, з работай органаў самакіравання і мясцовых органаў улады. Важна паглядзець, як вырашаюцца актуальныя для пэўнай тэрыторыі пытанні». Па словах спікера верхняй палаты парламента, важна звярнуць увагу, што яшчэ сёння трэба зрабіць, каб людзі, якія жывуць тут, адчувалі сябе камфортна, каб моладзь, атрымаўшы адукацыю, вярталася сюды, на сваю малую радзіму, — каб жыць, працаваць, развіваць свой горад, раён. «Таму мы абмяркоўваем гэта пытанне з запрашэннем шырокага кола спецыялістаў. Гэта і кіраўнікі рэспубліканскіх, мясцовых органаў улады, дэпутаты ўсіх узроўняў. Бо гэта самае галоўнае для дэпутата любога ўзроўню», — сказала Наталля Качанава, адзначыўшы, што ў Петрыкаўскім раёне работа пабудавана належным чынам дзякуючы таму, што задачы вырашаюцца разам з жыхарамі. «Я заўсёды з вялікай радасцю бываю ў рэгіёнах, таму што людзі, якія тут жывуць, шчыра любяць сваю малую радзіму», — падзялілася Наталля Качанава.

Удзельнікі выязнога пасяджэння азнаёміліся з развіццём мікрараёна Паўночны ў Петрыкаве. Горад за апошнія гады памаладзеў — будаўніцтва горна-абагачальнага камбіната ўдыхнула жыццё ў гэтыя мясціны. Ствараюцца новыя працоўныя месцы, будуецца арэнднае жыллё для спецыялістаў. Летась уведзена 10 шматкватэрных дамоў, за гэты год будзе пабудавана яшчэ сем. Сёлета 20 маладых спецыялістаў-медыкаў прыехалі працаваць у горад.

Наталля Качанава нагадала пра пастаўленую Прэзідэнтам задачу пра раўнамернае развіццё рэгіёнаў. «Гэта задача вызначана і VI Усебеларускім народным сходам — моцныя рэгіёны», — дадала спікер. Таму ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў выязнога пасяджэння была работа прадпрыемстваў, функцыянаванне сацыяльнай сферы, ЖКГ, іншыя надзённыя для раёна пытанні.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

*Аб чым яшчэ ішла гаворка на выязным пасяджэнні — падрабязна ў наступным нумары «Мясцовага самакіравання».*

Заканадаўчыя навацыі

# «ГЭТА ТЭМЫ, ЯКІЯ ХВАЛЮЮЦЬ БЕЛАРУСАЎ»

## Толькі за апошнія тыдні кастрычніка было праведзена больш за сотню дыялогавых пляцовак

**Абмеркаванне праектаў законаў «Аб Усебеларускім народным сходзе» і «Аб змяненні Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь» завяршылася рэспубліканскім семінарам-нарадай у Лідзе. Арганізатары і ўдзельнікі грамадскага дыялогу разгледзілі навацыі і прававыя аспекты законапраектаў, а таксама тыя задачы, якія яны павінны вырашаць у грамадстве.**



Фота БелТА.

Падрыхтоўка законапраектаў стартавала ў Палаце прадстаўнікоў адразу пасля правядзення канстытуцыйнага рэферэндуму. За гэты перыяд праведзена значная работа, якая вялася максімальна адкрыта. Акрамя парламентарыяў, у ёй прынялі ўдзел члены канстытуцыйнай камісіі, прадстаўнікі судовай улады, грамадства, навукоўцы, эксперты. Двойчы законапраект абмяркоўваўся на ўзроўні Прэзідэнта. Па ўсёй краіне праходзілі дыялогавыя пляцоўкі. Толькі за апошнія тыдні кастрычніка іх было праведзена больш за сотню. Як зазначыў **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА**, падчас абмеркавання паступіла паўтары сотні прапаноў, якія акумулюе Цэнтр прававой інфармацыі, частка паступае ў Палату прадстаўнікоў. На думку спікера ніжняй палаты, законапраект аб УНС можа быць прыняты ў першым чытанні ўжо сёлета, а на пачатку будучага года — у другім.

— Ад таго, як будуць падрыхтаваны вынесеныя на абмеркаванне законапраекты, як яны будуць працаваць, залежыць і эфектыўнасць палітычнай сістэмы Беларусі. Пачуць кожнага і зрабіць дакумент, што называецца, «ад зямлі» — самая важная сутнасць гэтага абмеркавання, — падкрэсліў Уладзімір Андрэйчанка.

Адзначалася, што новы закон значна павысіць статус УНС. Гэта будзе ўжо не дарадчы, а прадстаўнічы, канстытуцыйны орган. Ад яго будуць залежаць такія важныя пытанні, як кірункі ўнутранай і знешняй палітыкі. Такога раней не было. Ужо сёння людзі не застаюцца ў баку ад тых працэсаў, якія адбываюцца ў дзяржаве. Кожны стараецца зрабіць свой унёсак у гэты законапраект. На думку Старшыні Палаты прадстаўнікоў, УНС — дзейсны дэмакратычны інстытут, якому неабходна надаць канстытуцыйны статус.

Беспрэцэдэнтнасць грамадзянскага дыялогу адзначыў і **старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Палаты прадстаўнікоў Валянцін СЕМЯНЯКА**. Ён акцэнтаваў увагу на важнасці абмеркавання рэзанансных законапраектаў, якія павінны адлюстроўваць волю народа.

— Людзі разумеюць, што гэта навела ў дзяржаўным будаўніцтве і заканатворчасці запатрабавана сённяшнім часам і мае добрую будучыню. Такая ўсенародная экспертыза дазваляе яшчэ раз пераканацца ў новаўвядзеннях у наша жыццё з пункту гледжання простага чалавека, — зазначыў Валянцін Семяняка.

Старшыня камісіі выказаў меркаванне наконт змяненняў Выбарчага кодэкса. Па яго словах, менавіта ў гэтым прававым дакуменце, у адрозненне ад іншых дзяржаў, сабраны ўсе законы, якія датычацца выбарчага працэсу і рэферэндумаў. У ім улічаны як патрабаванні абноўленай Канстытуцыі, так і правапрымяняльная практыка, а таксама сучасныя тэндэнцыі ў свеце. Гэта дазваляе акумуляваць усе аспекты электаральнай кампаніі і, такім чынам, дабіцца адзінства ў падыходзе да заканатворчасці. Уладзімір Семяняка ацэньвае ступень гатоўнасці дакумента як даволі высокі, які мае ўсе падставы хутка трапіць на разгляд у Авальную залу.

**Старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў Святлана ЛЮБЕЦКАЯ** акрэсліла самыя рэзанансныя пытанні законапраекта аб УНС: фарміраванне народнага сходу, паўнамоцтвы дэлегатаў, парадак функцыянавання рабочых органаў і ажыццяўленне кантролю прынятых рашэнняў.

— Зараз прайшла вельмі важная стадыя падрыхтоўкі законапраекта аб УНС у выглядзе грамадскіх абмеркаванняў. Такі парадак прадугледжаны заканадаўствам нарматыўна-прававых актаў пры рабоце над любым законам перад яго ўнясеннем на разгляд Палаты прадстаўнікоў. Таму гэты этап мае сваёй мэтай атрымаць водгук і ацэнку тых ідэй і прапаноў, якія ўключаны ў праект закона. Прычым з боку тых, хто будзе рэалізоўваць гэтыя палажэнні, — нагадала Святлана Любецкая.

Яна звярнула ўвагу, што асноўныя моманты работы УНС ужо замацаваны ў Канстытуцыі. Цяпер стаіць задача па далейшым развіцці яго норм і механізмаў, канкрэтызацыі асобных функцый. І сёння мэта грамадскіх абмеркаванняў — прапрацаваць прапановы, атрымаць дадатковую інфармацыю, дэталізацыю асобных палажэнняў.

Яшчэ раз было падкрэслена, што прапановы паступаюць даволі масава. А гэта вельмі добры вопыт, бо людзі хутка ўключыліся ў разуменне, што адбываецца і што можна зрабіць.

— Прапановы паступаюць розныя: ад агульных ідэй і ацэнак да канкрэтных прапаноў у той ці іншы артыкул. Гэта правільна, калі дзяржава даносіць да грамадзян тыя ідэі, якія яна мае намер рэалізаваць шляхам удасканальвання заканадаўства. Гэтыя нормы павінны быць дзеючымі, а не фармальна замацаванымі на паперы. Таму мэта — атрымаць розныя прапановы: як станоўчыя, так і крытычныя. Тое, што падыдзе праекту закона, будзе ў комплексе вывучацца і мець працяг. Іншыя блокі прапаноў знойдуць адлюстраванне ў іншых прававых актах, — запэўніла Святлана Любецкая.

Праекты пакуль не ўнесены ў заканадаўчы орган і будуць дапрацоўвацца. Да гэтай работы падключаны і Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі. Законапраекты размешчаны на прававым форуме краіны, куды і паступаюць прапановы. Яны будуць сістэматызаваны. Чакаецца шмат прапаноў па выніках дыялогавых пляцовак.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Шайгу заявіў аб узмацненні канфрантацыі паміж Расіяй і Захадам



**Кіраўнік Міністэрства абароны РФ Сяргей Шайгу заявіў, што цяпер напружанасць у свеце працягвае імкліва расці, узмацняецца канфрантацыя краін Захаду з Расіяй. Пра гэта паведамляе ТАСС.**

Сітуацыю са стаўленнем да Расіі міністр ахарактарызаваў падчас пасяджэння сумеснай калегіі з ваенным ведамствам Беларусі.

«Гэта асабліва важна сёння, калі ў свеце імкліва нарастае напружанасць, разбураюцца асновы стратэгічнай стабільнасці, зніжаецца роля міжнародных інстытутаў і ўзмацняецца канфрантацыя паміж Захадам і Расіяй», — падкрэсліў ён.

Як дадаў кіраўнік Мінабароны РФ, асноўная мэта Захаду — знішчэнне ў тым ліку эканомікі.

«Ясна, што сітуацыя, якая склалася, выгадная ў першую чаргу ЗША. Вашынгтон імкнецца выкарыстоўваць яе для захавання глабальнага лідарства і максімальнага аслаблення іншых краін, у тым ліку — сваіх саюзнікаў у Еўропе», — сказаў Шайгу.

Паводле яго сцвярджэння, задача Захаду заключаецца ў знішчэнні расійскай эканомікі і ваеннага патэнцыялу.

## Габард: Байдэн парушыў перадвыбарнае абяцанне, развязаўшы канфлікт з Расіяй

**Амерыканскі лідар Джо Байдэн, выкарыстоўваючы Украіну, фактычна развязаў узброены канфлікт з Расійскай Федэрацыяй. Пра гэта заявіла амерыканскі палітык, былы член Кангрэса ЗША, Тулсі Габард, паведамляе РІА «Навіны».**

Габард нагадала, што Байдэн, будучы яшчэ кандыдатам у прэзідэнты, казаў, што спыніць разбуральныя і контрпрадукцыйныя войны, якія вядуць ЗША. Цяпер жа, праз два гады, ЗША аказаліся ўцягнутымі ў канфрантацыю з Расіяй, якая валодае ядзернай зброяй. Пры гэтым Вашынгтон у дадзенай сітуацыі выкарыстоўвае Кіеў, нібы марыянетку. Габард таксама звярнула ўвагу, што Байдэн адкідае дыпламатычныя шляхі ўрэгулявання канфлікту ва Украіне.

## Слоўнік Collins назваў permacrisis словам 2022 года

**Брытанскі слоўнік англійскай мовы Collins English Dictionary абраў permacrisis словам 2022 года. Пра гэта гаворыцца на сайце слоўніка.**

Тэрмін permacrisis утвораны шляхам зліцця двух слоў — permanent (пастаянны) і crisis (крызіс). «Пермакрызіс — тэрмін, які абазначае працяглы перыяд нестабільнасці і адсутнасці бяспекі», — сказана ў паведамленні.

Стваральнікі слоўніка растлумачылі, што гэта толькі адзін з выразаў, выдзеленых Collins, які апісвае працяглыя крызісы, што выпалі сёлета на долю брытанцаў і ўсяго свету. Гаворка ідзе аб палітычнай нестабільнасці ў краіне, ваенным канфлікце ва Украіне, а таксама аб змяненні клімату і павышэнні кошту жыцця.

Сярод прэтэндэнтаў на слова года таксама былі словы Kyiv, partygate (азначае скандал, выкліканы вечарынамі экс-прэм'ера Брытаніі Борыса Джонсана, якія ён праводзіў падчас каранавірусных абмежаванняў), warm bank (месца, дзе могуць сагрэцца людзі, якія не могуць абаграваць свае дамы) і carolean («каралінскі», абазначае ўсё, што звязана з Карлам III).

# Маёмасныя падаткі

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аплачана ўжо практычна 50 працэнтаў ад налічаных сум: зямельны і транспартны падатак — больш актыўна, а вось тэмпы паступлення плацяжоў падатку на нерухомасць трохі ніжэйшыя, каля 35 працэнтаў.

## Ільгота пры выплаце падатку на кватэру ёсць, але не для ўсіх

Андрэй Кавалеўскі растлумачыў, як аплачваецца падатак на нерухомасць пасля адмены льготы па адной кватэры. Справа ў тым, што сёлета адбыліся змяненні ў сістэме падаткаабкладання, у першую чаргу ў падатку на нерухомасць. Эксперт адзначыў: больш за ўсё абмеркаванняў выклікала адмена льготы па адной кватэры, якая накіравана на выраўноўванне ўмоў падаткаабкладання нерухомасці.

«Калі раней падатак на нерухомасць плацілі толькі грамадзяне, якія валодалі дзвюма і больш кватэрамі, то з бягучага года ўсе грамадзяне, у якіх ва ўласнасці знаходзіцца адна кватэра, павінны аплачваць гэты падатак, — распавёў ён. — Разам з тым аб'екты камерцыйнай нерухомасці (офісныя будынкі, вытворчыя памяшканні) не вызваляюцца ад аплаты падатку любой катэгорыяй плацельшчыкаў, а для шматдзетных сем'яў захаваны льготы па любой колькасці кватэр і жылых дамоў, якія ім належаць».

Ільгота таксама захаваецца для пенсіянераў, інвалідаў і шэрагу іншых катэгорый насельніцтва. «Яны не аплачваюць падатак на нерухомасць і ў дачыненні да адной кватэры. Напрыклад, калі пенсіянеру на праве ўласнасці належаць дзве і больш кватэр, то толькі адна з іх ільгатуецца. Аналагічны падыход прадугледжаны ў дачыненні да жылых дамоў, якія належаць такой катэгорыі асоб. Калі ў пенсіянера ёсць і жылы дом, і кватэра, то яны падаткам не абкладаюцца. Падатак для гэтых катэгорый асоб пачынае дзейнічаць толькі пры наяўнасці другога такога аб'екта, — растлумачыў начальнік галоўнага ўпраўлення. — Пенсіянеры не плацяць падатак на нерухомасць у дачыненні да любой колькасці, якія належаць ім, садовых домікаў, гаражоў, дач і машына-месцаў».

## Можна плаціць датэрмінова, а можна часткамі

Падаткі трэба заплаціць да 15 лістапада. Па словах Андрэя Кавалеўскага, іх можна плаціць датэрмінова, а можна часткамі. Арганізавана ўзаемадзеянне падатковых органаў са структурамі АРІП. Калі праведзена выплата часткі падатку, тады праз некалькі дзён, зайшоўшы ў АРІП, мы ўбачым, што будзе выстаўлена да аплаты рэшта сумы, якую неабходна было заплаціць.

**«Для шматдзетных сем'яў захаваны льготы па любой колькасці кватэр і жылых дамоў, якія ім належаць».**

Парадак аплаты падатку адбываецца любым зручным для плацельшчыка спосабам. Гэта можа быць аплата праз банкаўскія структуры і аддзяленні пошты. Прымаюцца наяўныя грашовыя сродкі, а таксама безнаяўныя сродкі праз пластыкавую картку. Але, напэўна, самым зручным спосабам з'яўляецца аддалены спосаб узаемадзеяння з АРІП.

**«Калі ў пенсіянера ёсць і жылы дом, і кватэра, то яны падаткам не абкладаюцца. Падатак для гэтых катэгорый асоб пачынае дзейнічаць толькі пры наяўнасці другога такога аб'екта».**

Заплаціць можна праз інфакіёск, інтэрнэт-банкінг, любыя мабільныя банкаўскія прадукты. У паведамленнях для зручнасці плацельшчыка зроблены код плацяжу ў АРІП, пры ўводзе якога няма неабходнасці хадзіць па «дрэве» сістэмы.

Калі чалавек згубіў паведамленне, нястрашна: на сайце падатковай сістэмы прадугледжаны сэрвіс, які дазваляе ўдакладніць асабісты ўліковы нумар плацельшчыка. Дастаткова зайсці на сайт і ўвесці свае персанальныя даныя. А маючы ўліковы нумар плацельшчыка, можна заўсёды аплаціць падаткі праз АРІП.

## Падатак на першую кватэру могуць нязначна павысіць налета

У Беларусі падатак на першую кватэру, уведзены з 2022 года, можа павялічыцца. Як адзначыў Андрэй Кавалеўскі, стаўка падатку можа вырасці прыкладна на 10 %. «Мы працуем над невялікім павышэннем». Аднак канчатковае рашэнне аб павышэнні яшчэ не прынята. Як удакладніў прадстаўнік МПЗ, законапраект аб змяненні ставак будзе разгледжаны дэпутатамі, а таксама Саветам Рэспублікі.

Пытанне аб адмене падатку на першую кватэру ў цяперашні час не разглядаецца, удакладніў Андрэй Кавалеўскі.

Нагадаем, што плата за першую кватэру з'явілася дзякуючы прынятым змяненням у Падатковы кодэкс у 2022 годзе. Падатак складае 0,1 % ад кошту аднаго квадратнага метра. Атрыманую суму неабходна памножыць на колькасць квадратных метраў кватэры.

Арыенціровачная цана аднаго квадратнага метра тыпавых кватэр, гаражоў, машына-месцаў, садовых домікаў, катэджаў адрозніваецца ў залежнасці ад рэгіёна. Ён самы высокі ў Мінску. Сёлета ў сярэднім новы падатак у Мінску складзе 50 рублёў на год, у рэгіёнах — у два разы менш, прагназаваў раней Мінфін.

## Транспартны падатак — меншы, а грошай — больш

Андрэй Кавалеўскі адзначыў, што транспартны падатак будуць аплачваць у нашай краіне 1 мільён 800 тысяч аўтааматараў у дачыненні да 2,6 мільёна транспартных сродкаў. Гэта найбольш дзейсны механізм адносна таго, які існаваў раней пры праходжанні тэхагляду.

Што датычыцца транспартнага падатку, то, па даных «Белтэхагляда», у 2020 годзе дзяржаўную пошліну аплаціла каля 500 тысяч плацельшчыкаў. «Раней шэраг грамадзян з-за нежадання аплачваць дзяржпошліну адмовіўся ад праходжання тэхнічнага агляду. І практыка збірання транспартнага падатку паказвае, што цяпер грамадзяне актыўна звяртаюцца для праходжання працэдуры тэхагляду і таксама актыўна аплачваюць падатак, — адзначыў Андрэй Кавалеўскі. — Таксама адбыўся рост сум. Калі ў 2020 годзе дзяржпошліна была аплачана на суму 100 мільёнаў рублёў, то транспартны падатак прад'яўлены на суму амаль 190 мільёнаў рублёў».

Ён дадаў, што і стаўкі транспартнага падатку на 30—50 % ніжэйшыя, чым стаўкі дзяржпошліны. «Грамадзяне актыўна ўдзельнічаюць у выкананні сваіх падатковых абавязацельстваў», — сказаў на заканчэнне ён.

## «Металалом» трэба было зняць з уліку

**Начальнік аддзялення рэгістрацыйна-экзаменацыйнай дзейнасці галоўнага ўпраўлення Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі Міністэрства ўнутраных спраў Аляксандр ШМАЯНКОЎ** расказаў аб прынятых змяненнях у Падатковы кодэкс, у якім аб'ектамі падаткаабкладання былі прызнаны транспартныя сродкі, зарэгістраваныя ў ДАІ.



— У сувязі з гэтым у грамадзян, у якіх былі ржавыя, згнілыя або забітыя машыны, узнікла праблемная сітуацыя. Яны звярталіся да нас з просьбай аб зняцці гэтых аўтамабіляў з дзяржаўнага ўліку. Таму была прадугледжана норма аб тым, што транспартны падатак не плацяць уладальнікі ў дачыненні да транспартных сродкаў, знятых з уліку да 1 ліпеня 2021 года.

**«Калі раней падатак на нерухомасць плацілі толькі грамадзяне, якія валодалі дзвюма і больш кватэрамі, то з бягучага года ўсе грамадзяне, у якіх ва ўласнасці знаходзіцца адна кватэра, павінны аплачваць гэты падатак».**

У адпаведнасці з дадзенай нормай быў распрацаваны спрошчаны парадак зняцця з уліку. Ён мае на ўвазе наступнае: калі пры звароце ўласніка з заявай адсутнічала інфармацыя аб эксплуатацыі аўтамашыны на працягу трох апошніх гадоў, якія папярэднічалі падачы заявы (мы правяралі па сваіх інфармацыйных базах), то транспартны сродак здымалі з уліку. Усю інфармацыю па зарэгістраваных машынах мы перадавалі ў Міністэрства па падатках і зборах.

Аляксандр Шмаянкоў таксама нагадаў, што грамадзяне, якія не паспелі зняць транспартны сродак з уліку да вышэйадзначанага часу, аплачваюць транспартны падатак.

**Сяргей КУРКАЧ.**

---

По сутнасці

# Колас нашых ростаняў



Мір — у хаце, хлеб — на стале, колас — у полі. Так проста і хораша. Беларуская ідылія. Здаецца, чагосьці яшчэ не хапае? Хіба томіка Коласа на паліцы.

Услухайцеся: Колас. У гэтым псеўданіме — вечная мара сапраўднага гаспадара. Яго жыццёвы светапогляд. Яго руплівае, штодзённае існаванне. І ў святы, і ў будні — увесь быт сялян быў аддадзены запаветнай ніве. Каб быў той колас буйны і наліты, кабеты нават свечкі ў цэрквах ставілі ды народнай магіяй грашылі. Уяўляеце, у кожным свяце прысутнічае код ураджайнасці палеткаў. Не заморскі хэлаўін. Земляробчы і народны бытавы каляндар зрасліся, як нітка з калаўроткам. Так і казалі: пакуль калаўрот круціцца — народная песня льецца. Усё дзеля таго багатага коласа. Такі ён, Колас, у нас і атрымаўся. Мабыць, увасобіў у сабе ўсю моц народнай культуры, павагі да працы, да поля, да сваёй самавітасці.

У лёгкім калыханні коласа адчуваецца выратавальны вецер падчас спякоты. У вячэрнія гадзіны ён перадае назапашаны подых навальніцы. Падчас жніва — аддае сябе цалкам пад малацьбу. Каб прынесці карысць. Такі і быў Колас. Хлопчык вырас, літаральна на лес гледзячы. Нават свае вершы спачатку падпісваў як Тарас Гушча. Гушчар. На Беларусі дастаткова пушчаў. Ад Налібок да Белавежжа. Але літаратурны талент уцяміў, што не ў гушчары жыве душа беларуса. Яна ў полі. На раллі. На сенажаці, на жніве. У Коласе. Налітым коласе літаратурных палеткаў.

«Новая зямля» — энцыклапедыя народнага жыцця. Тое кожны школьнік ведае. Але як гэтае жыццё апісана! Не марудна, не шэра — паэтычна. Так атрымліваецца, толькі калі сапраўды ўлюбёны, калі на крылах.

Што ні кажы, але толькі ён, хлапчук з лесніčоўкі над Нёманам, змог так па-майстэрску адлюстраваць мову роднай прыроды. Для гэтага трэба не толькі бачыць тое хараство — трэба адчуваць яго. Адчуваць людзей, што навокал. Без лішніх разваг, у адных дыялогах — такі светапогляд гаспадара і хлебароба адкрываецца чытачу. Нібы дзверы ў сенцах перад гасцямі падчас Каляд. На ўсю шырыню. Англійская перакладчыца Вера Рыч параўнала «Новую зямлю» з творамі Шэкспіра. Мо такое параўнанне і пасуе. Шэкспір. У кожнага народа ёсць свае Сенека, Пушкін, Байран. А ў беларусаў — Колас.

Што ні кажы, але толькі ён змог так яскрава перадаць светапогляд простага чалавека. Можна паспрачацца: а як жа глыбінны трагізм Шукшына, а шырыня Ясеніна? У Шукшына — сум па страчанай вёсцы, у Ясеніна — рамантычная нуда гарадскога хулігана. Колас — заўжды быў верны полю, хаце, простаму чалавеку. Ён не марыў, ён не прыкідваўся, ён жыў гэтым. І тая ж «Новая зямля» — хіба не Евангелле беларускай вёскі? І рэч не толькі ў налітым коласе. Рэч — у зерні беларускай душы. Філасофія сучаснага камбайнера, агранома, старшыні. Жыццё — не вынік, фінал, а сам працэс.

«На прастор, на шырокі разлог!» Яго літаратурны геній паклікаў беларусаў з багны забыцця, з-пад саламяных стрэх, падобных на ўвагнутыя галовы сялян. Ці да такога прастору клікаў Пясняр?

Шырокі праспект, аўтамабільны і спажывецкі трафік, звычайная сталічная мітусня. Гандлёвыя цэнтры, харчовыя маркеты — сапраўдны пакупніцкі хаб. Хлеб і да хлеба. А трошкі далей, сімвалічна, месца больш для душы. Канцэрты, справаздачы, вечарыны... Як напамін, што не хлебам адзіным... Ёсць у гэтым архітэктурным рашэнні зерне. Пачакайце, не спяшайцеся далей. Узніміце вочы. Паглядзіце на Коласа. Манументальнага і велічнага — як яго творчасць. Адначасова блізкага і свайго — як ён і яго літаратура.

Углядаецца той Колас у далячынь. Насупраць — філармонія. Але ён глядзіць далей. Бульвар Мулявіна. А ці не радкі генія літаратуры ўлюбілі генія музыкі ў Беларусь? Да мурашак па целе, да непаўторнага выканання, да таго, каб Беларусь для яго стала родным кутом.

Няма ў творчасці Коласа фальшу. Таму нават самыя лжывыя і фэйкавыя спробы пабудаваць брудныя паліттэхналогіі на супрацьпастаўленні беларускасці не могуць выкарыстаць Коласаву спадчыну. Літаратурны бэкграўнд — мара аб зямлі. Сваёй. Не аб каршэрынгавым прэзідэнцe, не аб рэйве замест дажынак, не аб евангелістах праграмавання (так прафесія называецца) замест хлебаробаў. А аб сваім надзеле. Бацькоўскую мару, увасобленую на паперы Коласам, увасобіў у жыццё Прэзідэнт. ... Наўрад ці героі Байрана альбо Оруэла селі б стомленымі касцамі на сенажаць. А герой Коласа — натуральна. І наш Прэзідэнт — таксама. Усё ад жыцця.

Вось мы ўсё шукаем нацыянальную ідэю. А мо варта звярнуцца да старонак уласнай класікі? Там і знойдзем такія неабходныя зярняты ад літаратурнага сейбіта Коласа.

А вось колькі слоў з успамінаў самога Песняра: «Лабановіч — мой двайнік. Выдуманага ў яго характары і паводзінах нічога няма». Пасталеў той Лабановіч. З летуценніка-рэвалюцыянера вырас у разважлівага дзядзьку Якуба. Шчыры настаўнік стаў яшчэ і мудрым настаўнікам. Для ўсяго беларускага народа. Але ўлюбёнасць у Радзіму, яе людзей, у поле, у калоссе — засталася. У той сапраўдны пах чэрвеньскай сенажаці, у тую смагу ліпеньскай гарачыні, у той жнівеньскі колас. «Хацеў дапамагчы знайсці вам лепшую дарогу ў жыцці, лепшую за тую дарогу, па якой ішлі вашы дзяды і бацькі».

Адтуль, з вышыні нябёсаў, з глыбінь літаратурнага космасу, са старонак творчай спадчыны, праз жывыя вочы нават манумента, цёплым, задуменным, спагадлівым позіркам, у кампаніі сваіх літаратурных вобразаў назірае Колас за намі. На скрыжаванні дарог і часоў гучыць запавет, нібы шолах калосся: «На прастор, на шырокі разлог!».

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

# «Настаўніку трэба апярэджваць час і нават паскараць яго»

## Беларускае педагагічнае таварыства адзначыла паўвекавы юбілей

**За час свайго існавання грамадскае аб'яднанне стала прафесійнай пляцоўкай для абмеркавання самых актуальных пытанняў адукацыйнай практыкі на ўсіх узроўнях адукацыі. На прайшоўшым у БДПУ справаздачна-выбарным з'ездзе гэтага грамадскага аб'яднання і ўрачыстасцях быў дадзены старт новаму этапу яго развіцця.**

Прывітальны адрас дэлегатам з'езда з нагоды юбілею даслала **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА.** «На працягу пяці дзесяцігоддзяў дзейнасць аб'яднання, якое ахоплівае больш за тысячу вучоных-педагогаў, настаўнікаў, грамадскіх дзеячаў, служыць важнай мэце — развіццю творчай ініцыятывы педагагічных работнікаў, распаўсюджванню перадавога вопыту і ўдасканаленню майстэрства, умацаванню сувязі навукі з практыкай, павышэнню прэстыжу прафесіі, — падкрэсліваецца ў віншавальным адрасе. — Глыбокай ўдзячнасці па праве заслугоўваюць усе тыя, хто стаяў каля вытокаў аб'яднання, сваім талентам і руплівай працай спрыяючы павышэнню ролі і аўтарытэту і ролі ў развіцці нацыянальнай сістэмы адукацыі, і ўсе тыя, хто цяпер прысвячае сябе прафесіі, узбагачаючы беларускую педагогіку інавацыйнымі падыходамі».

Адным з ветэранаў Беларускага педагагічнага таварыства з'яўляецца **заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь Ганна ДАБРЫНЕЎСКАЯ,** якая мае за плячыма каля 60 гадоў прафесійнага стажу: яна працавала настаўнікам, дырэктарам гімназіі, педагогам-метадыстам вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі ў Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, дзе курыравала інавацыйную дзейнасць.

— Сёння прыгожая дата. Што мы рабілі ўсе гэтыя гады? Чым жылі? Мы кантактавалі, дзяліліся ідэямі, праблемамі, кнігамі. Мы хацелі ісці наперад і весці за сабой нашых вучняў і калег. У 1990-я гады ў краіне быў адкрыты першы ліцэй — пры БДУ, першыя гімназіі. Было вельмі цяжка, мы многае рабілі інтуітыўна, але заўсёды адчувалі падтрымку з боку Міністэрства адукацыі і дзяржструктур. З намі побач паўстачисленні вучоныя — члены нашага педагагічнага таварыства. Гэта дапамагала настаўнікам і натхняла. Калі я кіравала педагагічнай гімназіяй, да нашых вучняў у класы прыходзілі рэктары, гэта былі гутаркі як паміж роўнымі. Былі часы, калі ў нашай установе адукацыі працавала па тры дактары навук, шмат кандыдатаў навук і аспірантаў. Аднойчы ў Мінск прыбыла вельмі прадстаўнічая дэлегацыя з Расіі, з Акадэміі педагагічных навук — адразу 12 акадэмікаў. Яны кантактавалі з нашымі вучнямі і настаўнікамі. І мы імкнуліся стаць лепшымі.

Памятаю, як гімназічны бум у сістэме адукацыі змяніўся інавацыйным. Быў выпадак, калі сярод шматлікіх заявак на рэалізацыю інавацыйных праектаў паступіла 59 заявак на ўдзел у праекце па арганізацыі мультыпрофільнага навучання ў школе. А ўсяго з устаноў адукацыі паступіла больш за тысячу заявак. І ва ўсе трэба было паглыбіцца і паспрыяць іх увасабленню. Было цяжка, але вельмі цікава. Сёння іншы час, іншыя патрабаванні і іншыя складанасці, — канстатавала Ганна Дабрынеўская. — Новыя хуткасці, але і новыя магчымасці. Настаўніку трэба не проста адпавядаць, але ў чымсьці і апярэджваць час, і нават паскараць яго. Мы не можам дазволіць сабе адстаць ад нашых вучняў, якія ўжо нарадзіліся ў лічбавым свеце. Нам трэба вучыцца працаваць з вялізнымі аб'ёмамі інфармацыі, бо сёння не хапае часу, каб іх апрацаваць і выкарыстаць з карысцю. Але на ўроку па-ранейшаму ўсё залежыць ад настаўніка.

Да ўдзельнікаў і гасцей урачыстага мерапрыемства звярнуўся **міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ**. Кіраўнік ведамства падкрэсліў, што юбілейнае мерапрыемства мае асаблівае значэнне для ўсёй педагагічнай грамадскасці нашай краіны: «Усе гэтыя гады мы прайшлі разам. У кожным рэгіёне нашай краіны, вобласці, горадзе, раёне актыўна працавалі педагогі-навукоўцы, настаўнікі-практыкі, яны ўзнімалі важныя праблемы развіцця сучаснай педагагічнай навукі, распаўсюджвалі эфектыўны педагагічны вопыт... Але час не стаіць на месцы, адукацыйныя патрэбы мяняюцца, таму для развіцця трэба бачыць перспектывы, распрацаваць стратэгію ўдасканалення Беларускага педагагічнага таварыства. Яно павінна стаць той арганізацыяй, якая аб'ядноўвае педагогаў усіх узроўняў адукацыі. Галоўная задача — не проста абменьвацца думкамі, а выпрацоўваць рашэнні па найбольш важных, найбольш вострых, дыскусійных пытаннях развіцця сістэмы адукацыі, для таго каб мы маглі прымаць сапраўды выверанныя, узважаныя рашэнні, якія будуць перспектыўнымі ў будучыні. Тады мы атрымаем не проста адукаванае пакаленне, а пакаленне, выхаванае на нашых духоўна-маральных каштоўнасцях. Я веру, што Беларускае педагагічнае таварыства дастойна справіцца з ускладзенымі на яго задачамі, захоўваючы традыцыі паўвекавой работы і рухаючыся да новых, перспектыўных мэт на карысць развіцця нашай краіны».

Падчас работы з'езда быў выбраны новы **старшыня Беларускага педагагічнага таварыства. Прафесійнае аб'яднанне ўзначаліў рэктар Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, доктар навук, прафесар Аляксандр ЖУК.**

— Я перакананы, што з улікам сусветных адукацыйных тэндэнцый і глабальных выклікаў спектр задач таварыства трэба пашыраць і канкрэтызаваць. Яго дзейнасць павінна быць накіравана найперш на арганізацыю эфектыўных прафесійных камунікацый, трэба больш клапаціцца аб выяўленні і падтрымцы даследчых і адукацыйных ініцыятыў і наватарства ў педагагічным асяроддзі, — падзяліўся новы старшыня сваім бачаннем дзейнасці Беларускага педагагічнага таварыства. — Трэба ўзмацніць інфармацыйную работу, апаратыўна і змястоўна інфармаваць педагогаў аб сучасных сусветных тэндэнцыях у адукацыйнай практыцы і новых падыходах. Трэба больш актыўна прыцягваць педагогаў-практыкаў да экспертнай дзейнасці. Члены нашага аб'яднання павінны даваць прафесійную ацэнку прапанаваным канцэпцыям і дзяржаўным праграмам. Яшчэ адна найважнейшая місія — фарміраванне іміджу педагога. Сучасны педагог — інтэлігентны, высокакультурны, ён валодае сучаснымі тэхналогіямі, інавацыйна мысліць і ўсведамляе значнасць сваёй прафесіі. Каму, як не нам, клапаціцца пра тое, хто прыйдзе ў нашу прафесію...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**


**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор аукциона)
информирует о проведении открытого аукциона
по продаже имущества, принадлежащего
**государственному предприятию «БелПСХАГИ»**
(Продавец)

**Аукцион состоится 06.12.2022 в 11.00**
по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.

**Лот № 1:**
ЛЕГКОВОЙ ВНЕДОРОЖНИК УНИВЕРСАЛ CHEVROLET NIVA 212300,
кузов (рама) № X9L212300B0351853, 2011 г. в.
Начальная цена с НДС – 3 993,36 руб.

**Лот № 2:**
ЛЕГКОВОЙ ВНЕДОРОЖНИК УНИВЕРСАЛ CHEVROLET NIVA 212300-55,
кузов (рама) № X9L212300F0549378, 2015 г. в.
Начальная цена с НДС – 2 787,06 руб.

**Лот № 3:**
ПРИЦЕП-ДАЧА КУПАВА-8133,
кузов (рама) № Y3H813300V0014750, 1997 г. в.
Начальная цена с НДС – 2 642,96 руб.

Место нахождения Лотов №№ 1–3:
**Минская обл., Минский р-н, аг. Прилуки, ул. Мира, д. 1а.**
Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу **gki.gov.by** и Организатора аукциона **ino.by.**

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**
УНП 190055182



ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Минского филиала РУП «Белпочта» (продавец) проводит повторный открытый аукцион**

**ПО ПРОДАЖЕ ГРУЗОВОГО ФУРГОНА «PEUGEOT PARTNER PGP 79»**

**2010 года выпуска, цвет – голубой, грузоподьемность – 2 160 кг, масса без нагрузки – 1 370 кг, идентификационный № Y39179000A0075020, VF3GAWJYBAX513565, свидетельство о государственной регистрации – МАА 2399716, инв. № мин-19700, регистрационный знак АК 1525-7.**

**Объект расположен по адресу: г. Минск, ул. Стебенева, 10В.**

**Начальная цена** с НДС (20 %) – **1 042,81** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **104,00** бел. руб.)
*Начальная цена снижена на 80 %.*
Информация о торгах опубликована на сайтах: **gki.gov.by, rlt.by.**
Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 01.09.2022, 12.10.2022.

Аукцион состоится **22.11.2022** в **14.00**
по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **21.11.2022** до **16.00** по указанному адресу **в каб. 320**.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: 272-53-97, (8029) 680-12-86.**
УНП 101120215



**ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН**

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.** Продавец: **Речицкое районное потребительское общество** (УНП 400037088), 247500, г. Речица, ул. Привокзальная, д. 2 в лице ликвидатора Беланова Руслана Николаевича, тел. +375 (29) 690-00-10. Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **16 ноября 2022 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 340/С-300524, пл. 121 кв. м, здание магазина № 18, составные части и принадлежности: пристройка из газосиликатных блоков, два крыльца, сарай, уборная, калитка, забор. Находится на берегу реки Днепр. Гомельская обл., Речицкий р-н, Заспенский с/с, д. Луначарск, ул. Советская, 21. На земельном участке с кадастровым № 324584203601000043 пл. 0,0393 га, право аренды | 18 720,00 |
| 2 | Капитальное строение с инв. № 340/С-313196, пл. 243,3 кв. м, магазин, составные части и принадлежности: пристройка, тамбур с крыльцом, уборная, пандус, крыльцо, отмостка, котел топливный КСТБ-75. Находится на берегу реки Днепр. Гомельская обл., Речицкий р-н, Холмечский с/с, 27. На земельном участке с кадастровым № 324589003601000292 пл. 0,0608 га, право аренды | 20 700,00 |
| 3 | Изолированное помещение с инв. № 340/D-21166, пл. 312,6 кв. м, помещение магазина, Гомельская обл., Речицкий р-н, Озерщинский с/с, д. Озерщина, ул. Набережная, д. 79А, пом. 2, на земельном участке с кадастровым № 324587001101000653 пл. 0,8438 га, право аренды, доля в праве 11/25 | 38 250,00 |

Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 04.11.2022 г. 09.00 по 15.11.2022 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее десяти рабочих дней со дня проведения торгов. Срок оплаты предмета торгов – в соответствии с заключенным договором. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 30.08.2022 г.



**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ № 2022.Б.002.00127**

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего Открытому акционерному обществу «Минский завод строительных материалов», УНП 100008102, в отношении которого открыто производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 455-5Б/2018 в экономическом суде г. Минска

Номер лота, вид выставляемого на электронные торги имущества:

**Лот № 1. Недвижимое имущество. Информация о предмете торгов, в т. ч. место нахождения (№ 1/07-2022):**

Кап. строение с инв. № 500/С-48495 площадью 685,0 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Янки Мавра, 47/47, наименование: ремонтно-строительный цех; назначение: здание неустановленного назначения. Кап. строение с инв. № 500/С-31587 площадью 20,0 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Янки Мавра, 47/48, наименование: здание сварочной: РСЦ; назначение: здание специализированное для производства строительных материалов. Кап. строение с инв. № 500/С-48494 площадью 95,0 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Янки Мавра, 47/44, наименование: склад; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Кап. строение с инв. № 500/С-31589 площадью 4,0 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Янки Мавра, 47/45, наименование: надворный туалет – РСЦ; назначение: здание неустановленного назначения. Кап. строение с инв. № 500/С-30045 площадью 24 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Янки Мавра, 47/46, наименование: склад для маляров – РСЦ; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ.

Вышеуказанные кап. строения расположены на зем. участке с кадастровым № 500000000006004362 площадью 16,0587 га по адресу: г. Минск, ул. Я. Мавра, 47 (общее долевое право постоянного пользования). Покупателю переходит доля в праве постоянного пользования зем. участка с кадастровым № 500000000006004362 из расчета площади для обслуживания объектов 3800,42 кв. м.

**Начальная цена:** 277 200,00 бел. руб. без НДС.

**Минимальная цена**: 221 760,00 бел. руб. без НДС.

**Дополнительное условие по лоту № 1:** Покупатель обязан заключить с Продавцом договор купли-продажи на приобретение объектов движимого имущества на общую сумму **96 542,77** бел. руб. без НДС. Ознакомиться с перечнем имущества можно на электронной торговой площадке по электронному адресу: http://etpvit.by/ – «Недвижимость».

**Условия электронных торгов:** Победитель торгов (единственный участник торгов, выразивший согласие на приобретение предмета электронных торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов) обязан: в течение 5 дней со дня проведения электронных торгов возместить затраты за организацию и проведение торгов, и оплатить услуги оператора ЭТП; возместить расходы Продавца на проведение независимой оценки имущества в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения электронных торгов в сумме 5685,20 бел. руб. без НДС, подписать договор купли-продажи предмета электронных торгов и заключить договор купли-продажи движимого имущества (оборудования) в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения электронных торгов; оплатить стоимость приобретенного имущества не позднее 10 рабочих дней с даты подписания договоров купли-продажи. Демонтаж, погрузка и вывоз имущества осуществляются за счет Покупателя в срок, указанный в договоре купли-продажи.

Размер шага составляет 5 процентов от начальной цены лота.

Дата и время начала и завершения электронных торгов: **05.12.2022 с 9.00 до 16.00.**

Электронные торги проводятся на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» по электронному адресу: http://etpvit.by/.

Прием документов осуществляется на электронной торговой площадке по электронному адресу: http://etpvit.by/ **по 16.00 02.12.2022.**

Для участия в электронных торгах на электронной торговой площадке по электронному адресу: http://etpvit.by/ необходимо подать заявку на участие в электронных торгах и пройти аккредитацию в качестве участника электронных торгов, а также перечислить задаток в срок **до 16.00 02.12.2022.**

**Задаток по лоту № 1** в сумме **27 720,00** (двадцать семь тысяч семьсот двадцать рублей 00 копеек) белорусских рублей должен быть зачислен на счет коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга», УНП 390477566, р/с BY93MTBK30120001093300066782 в ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, код операции 40901.

Победителем электронных торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот.

Справочная информация:

Контактный телефон антикризисного управляющего +375 17 374 23 93.

Контактный телефон для осмотра объектов: по лоту № 1 +375 44 793 73 06.

Контактный телефон лица, организующего торги на основании договора поручения: 8 (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63.

Дата, время и адрес доступа (ознакомления) с предметом электронных торгов (информацией о предмете электронных торгов – в отношении нематериальных активов) в рабочих дни с 09.00 до 16.00 по предварительному согласованию с Продавцом по месту нахождения имущества (г. Минск, ул. Я. Мавра, 47).

Затраты на организацию и проведение электронных торгов определяются согласно сметы затрат, затраты на обслуживание ЭТП определяются согласно прейскуранту ЭТП. Ознакомление с затратами на организацию и проведение электронных торгов производится на http://etpvit.by/ до начала торгов.

Возмещение затрат на организацию и проведение электронных торгов осуществляется в соответствии с законодательством.

# БУРЫ ВУГАЛЬ І ВАДА З-ПАД КАПЯЖА



## Што чакае палякаў?

**Гадавая інфляцыя ў Польшчы ў кастрычніку склала рэкордныя 17,9 працэнта, паведаміў інфармацыйны партал польскага радыё RMF 24. Гэта максімальны паказчык за апошнія чвэрць стагоддзя. Раней польскія ўлады заяўлялі, што пік інфляцыі прыйдзецца на жнівень, пасля чаго цэны пачнуць зніжацца. Аднак такія разлікі не спраўдзіліся. Інфляцыя паскараецца — у верасні яна складала 17,2 працэнта. У кастрычніку ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года цэны на прадукты харчавання і безалкагольныя напіткі ўзраслі на 21,9 працэнта, энерганосьбіты паддаражэлі на 41,7 працэнта, аўтамабільнае паліва — на 19,5 працэнта. Калі параўноўваць цэны ў верасні і кастрычніку, то кошт харчовых тавараў павялічыўся за месяц на 2,7 працэнта, энерганосьбітаў — на 2 працэнты, паліва — на 4,1 працэнта. Адносная беднасць закранула прыкладна 4,6 мільёна палякаў, паведаміў польскі партал Gazeta Pravna. Мяркуючы па ўсім, у выніку дзеянняў польскіх уладаў гэты жудасны паказчык працягне павялічвацца надалей. Што ж чакае палякаў?**

### ПІКА ІНФЛЯЦЫІ НЕ ВІДАЦЬ

Па словах галоўнага эканаміста Bank Pocztowy Монікі Куртэк, пакуль не варта чакаць, што цэны на спажывецкія тавары знізяцца. «Прадукты харчавання ды іншыя тавары і паслугі прадоўжаць даражэць», — прагназуе эканаміст. На ўзровень інфляцыі, на думку Куртэк, будзе ўплываць рост цэн на ўгнаенні, электраэнергію, паліва. Пры гэтым яна лічыць, што піка інфляцыі ў Польшчы можна чакаць не раней за люты наступнага года. Між тым эксперты прагназуюць, што двухзначныя паказчыкі інфляцыі будуць фіксавацца ўвесь наступны год.

У штогадовай справаздачы «Назіранне за беднасцю», праведзенай EAPN Poland — Еўрапейскай сеткі па барацьбе з беднасцю, прагнозы для Польшчы вельмі песімістычныя. Інфляцыйныя чаканні спажыўцоў і бізнесу растуць. І больш за ўсё церпяць сацыяльна неабароненыя пласты насельніцтва. Беднасць у Польшчы мае твар пажылога чалавека і інваліда, заявілі ў камітэце Еўрапейскай сеткі па барацьбе з беднасцю.

У Польшчы адзначаюць пашырэнне новага класа бедных, паведаміла Gazeta Wyborcza. Гаворка ідзе аб грамадзянах, у якіх ёсць работа, але ў іх няма грошай на базавыя патрэбы (жыллё, ежу, лекі, тавары для дзяцей і іншае). Выданне прыводзіць у прыклад гісторыю Тэрэзы, жанчыны, якая адна выхоўвае двух дзяцей. Для яе склалася парадаксальная сітуацыя: яна занадта «багатая» для муніцыпальнага жылля і занадта бедная для арэнды. У выніку яна вымушана была заняць пустую кватэру. Муніцыпальнага жылля ў краіне не хапае, умовы яго атрымання вельмі жорсткія. Тым часам працэнты на іпатэку ў Польшчы многім не па кішэні.

### РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА ВЫЖЫВАННІ

Рэкордная інфляцыя, паглыбленне ўмоў жыцця і, самае галоўнае, неверагодны рост цэн на энергарэсурсы штурхаюць польскія ўлады не на пошук выратавальных рашэнняў, а на... складанне рэкамендацый па выжыванні. Людзям на поўным сур'ёзе рэкамендуюць у выпадку недахопу сродкаў на аплату водазабеспячэння збіраць дажджавую ваду або «разаграваць» снег. «Тыя, хто вельмі пастараецца, могуць назапасіць лішкі вільгаці, каб пасля іх прадаць і на гэтым нават зарабіць», — прыводзіць адно з польскіх выданняў словы мясцовага кіраўніка горада.

Іншым улады рэкамендуюць у мэтах эканоміі не запускаць радыятары ў дамах, каб пазбегнуць звышлімітавых сум на квітанцыях. «Лепш інвеставаць свае час і сілы ў вязанне шарсцяных світараў і шкарпэтак», — піша іншае выданне. А каб цяпло не выходзіла з дому, жыхарам Польшчы раяць менш хадзіць па вуліцах, рэстаранах і крамах, а больш сядзець дома і «надыхваць» цяпло. Або хадзіць сем'ямі ў госці адзін да аднаго па чарзе, каб дыхаць «гуртам» і такім вось чынам рабіць жыллё цяплейшым.

«Цэны ў крамах павышаюцца ледзь не штодня, працэнтныя стаўкі звар'яцелі, паліва, верагодна, ніколі не было такім дарагім, кошт электраэнергіі і газу расце, як і інфляцыя», — заявіў адзін з найбуйнейшых польскіх вэб-парталаў Onet. Выданне прыводзіць пяць простых спосабаў, як захаваць грошы. У халады раяць памяншаць тэмпературу ў памяшканні, хадзіць у шарсцяных тэпцях і світары. «Няхай шпацыр па хаце ў футболцы будзе зарэзерваваны для цёплых месяцаў года», — дадае выданне. Таксама прапануецца купляць прадукты адзін раз у тыдзень дзеля эканоміі, не праходзіць міма прадуктаў, у якіх заканчваецца тэрмін прыдатнасці, паколькі яны прадаюцца па больш нізкіх цэнах. Варта часцей наведваць сэканд-хэнды. Таксама палякам рэкамендуюць часцей пакідаць грошы і плацежную картку дома.

### ПАЛІВА ЦІ ЗБРОЯ?

Найстарэйшы ўніверсітэт Польшчы — Ягелонскі ў Кракаве — першы занякі ў анлайн. Прычына — рэзкі рост цэн на электраэнергію. Ягелонскі ўніверсітэт сутыкнецца з 700-працэнтным павелічэннем затрат на электраэнергію ў 2023 годзе — пасля заканчэння тэрміну дзеяння яго бягучага кантракта з дзяржаўным пастаўшчыком. Аб гэтым заявіў рэктар Яцэк Попель, паведаміла eadaily.com. Паводле яго даных, налета кіраўніцтву польскай ВНУ давядзецца заплаціць 182 млн злотых у параўнанні з цяперашнімі 27 млн злотых. «Такія выдаткі ўпершыню з моманту стварэння ўніверсітэта паставяць пад пытанне яго функцыянаванне (грамата аб заснаванні ўніверсітэта ў Кракаве была выдадзена 12 мая 1364 года польскім каралём Казімірам III. — **eadaily**)», — заявіў рэктар. Раней Нацыянальная акадэмія драматычнага мастацтва ў Варшаве ўжо аб'явіла, што з-за высокіх затрат на электраэнергію ўсе практычныя заняткі будуць праходзіць да Каляд, а ў студзені і лютым 2023 года будуць праводзіцца толькі тэарэтычныя анлайн-заняткі.

Палякі масава кінуліся скупляць небяспечны для здароўя буры вугаль для абагравання дамоў напярэдадні халадоў. Як піша выданне money.pl, за дзесяць дзён з пачатку продажаў закантрактавана 7,5 тоны адпаведнага паліва. Аглядальнік партала Катажына Бартман удакладніла: улады «сцвярджаюць, што раней яго купілі самыя бедныя, а цяпер скупляюць усе, хто можа». Калі прымяніць гэты вугаль у новых печах, верагодныя аварыі, піша аглядальнік money.pl. Па словах эксперта па энергетычнай бяспецы Фонду Пуласкі Пшэмыслава Залескага, урад дазваляе купляць паліва «усімі магчымымі шляхамі», паколькі асцерагаецца крызісу ў грамадстве. У кантэксце дастаўкі каменнага вугалю з узбярэжжаў працэсей дазволіць грамадзянам выкарыстоўваць для ацяплення больш даступны буры вугаль. Між іншым, яго якасць не адпавядае экалагічным нормам — ён змяшчае паўтара працэнта серы, што перавышае мяжу нормы. Апроч негатыўнага ўплыву на сістэму ацяплення, гэта таксама шкодзіць здароўю людзей.

Высветлілася, што вугаль, які Варшава закупляе ў Аўстраліі, не гарыць. Да такой высновы прыйшла польская тэлекампанія TVN24, правёўшы эксперымент у жывым эфіры. Тэлежурналісты вяшчалі з дому польскага садоўніка Багдана Труса, які жыве ў вёсцы Хшыпск-Велькі ў Вялікапольскім ваяводстве. Фермер закупіў аўстралійскі вугаль для абагравання цяпліц з цюльпанамі. Прадпрымальнік паспрабаваў распаліць вугаль газавай гарэлкай перад камерай TVN24. Не выйшла. Эксперымент паказаў, што нагрэтая сыравіна згасае ўжо праз некалькі секундаў пасля таго, як яе дасталі з полымя. «Я аддаў аўстралійскі вугаль сваім работнікам для ацяплення кватэр. Але праз два дні прыйшоў работнік з крыкам: «Гаспадар, гэты вугаль не гарыць ні ў адной з печаў!» — расказаў Трус. Фермер прызнаецца, што, займаючыся садоўніцтвам 25 гадоў, упершыню бачыць, каб набыты вугаль не гарэў. Раней паведамлялася аб тым, што расійскі вугаль Польшча памяняла на паліва з ПАР, Аўстраліі і Калумбіі. Аднак яго якасць не адпавядае стандартам. Па даных Rzeczpospolita, калі цеплатворнасць імпартуемага вугалю нізкая, то і запасы яго могуць скончыцца хутчэй, чым чакалася.

Відавочна, што прыярытэты афіцыйнай Варшавы далёкія ад жыццёва неабходных патрэб простых палякаў. Як заявіў міністр абароны Марыюш Блашчак, выступаючы ў Сейме, Польшча імкнецца да пашырэння ваеннай інфраструктуры і аб'ектаў для войска ЗША, паведаміў ТАСС. Міністр нагадаў, што апошнім часам Варшава актыўна закупляе ваенную тэхніку і зброю, а таксама паступова павялічвае колькасць сваёй арміі, якая перавышае ўжо 150 тысяч чалавек. Польскі ўрад вырашыў інвеставаць у пашырэнне часцей на ўсходзе краіны: на тэрыторыі 18-й механізаванай дывізіі з'явяцца новыя гаражы і будынкі казармаў, таксама будуць пабудаваны аэрадромы для самалётаў F-35 і палігоны для артылерыі HIMARS.

### ПАРАНАІДАЛЬНА-ПРАВАКАЦЫЙНАЯ ПАЛІТЫКА

Ва ўмовах выклікаў, што сёння стаяць перад Еўропай і ўсім светам, відавочныя перавагі беларускай мадэлі дзяржавы. Такое меркаванне ў эфіры тэлеканала «Беларусь 1» выказаў польскі палітык Кшыштаф Талвінскі. «Мы хочам і палякам, і жыхарам Беларусі паказаць, што палякі таксама маюць уласную палітычную думку. Што ёсць палякі, якія хочуць нармальнага, добрасуседскага супрацоўніцтва з Рэспублікай Беларусь, — адзначыў ён. — Я гэта называю параналідальна-правакацыйнай палітыкай, якую праводзіць польскі ўрад у адносінах да Беларусі і Расіі».

Па словах Кшыштафа Талвінскага, яго вельмі цікавіць сельскагаспадарчая палітыка Беларусі. «Мяне цікавіць гэтая мадэль земляробства. Не хаваю, што некалькі гадоў таму я крыху турбаваўся, ці атрымаецца наогул у вас нешта, ці справіцеся вы з такой спецыфічнай мадэллю ва ўсёй Еўропе, ці будзе ад яе эфект і ці зможаце вы ёю скарыстацца, — падзяліўся палітык. — Вось скончыўся гэты тэст, гэты пробны перыяд. І аказалася, мадэль, выбраная беларускай дзяржавай у галіне сельскай гаспадаркі, — найбольш устойлівая да тых выклікаў, якія ў нас ёсць цяпер. У вас ёсць сыравіна, яе перапрацоўка, якая знаходзіцца ў руках беларускай дзяржавы, і гандаль, на які таксама мае свой уплыў. Атрымліваецца зусім іншая сітуацыя, чым у нас. Вы з гэтым спраўляецеся, асабліва цяпер, калі вы змагаецеся са спекуляцыйнымі цэнамі».

Як заўважыў палітык, Польшча свой гандаль аддала. «А гандаль у рыначных адносінах вырашае ўсё. Твая прадукцыя не мае значэння, бо калі ў маіх руках гандаль, то я вырашаю, дзе, калі, колькі і што ты павінен вырабляць. Калі ты аддаеш гандаль — аддавай і незалежнасць. Усе гэтыя аспекты, якія я назваў, — атрыбуты незалежнасці, якія мы, палякі, ужо аддалі: мадэль сельскай гаспадаркі, перапрацоўкі і гандлю, — заўважыў Кшыштаф Талвінскі. — І вось цяпер, ва ўмовах такіх выклікаў перад усёй Еўропай, перад усім светам, відавочная перавага вашай мадэлі. І мы таксама так хочам».

**Пётр ДУНЬКО.**

**Тым часам**

## «АКТ АГРЭСІІ СУПРАЦЬ БЕЛАРУСІ»

**Падрыхтаваны зварот у Міжнародны крымінальны суд**

Ліберальна-дэмакратычная партыя Беларусі падрыхтавала зварот у Міжнародны крымінальны суд у адносінах да Польшчы за падрыхтоўку акта агрэсіі супраць Беларусі, заявіў старшыня ЛДПБ, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Алег Гайдукевіч, паведаміла БелТА.

«Мы афіцыйна ў адпаведнасці з міжнароднымі дакументамі адпраўляем зварот у Міжнародны крымінальны суд, які знаходзіцца ў Нідэрландах, на пракурора аб прыцягненні да крымінальнай адказнасці вышэйшых службовых асоб Рэспублікі Польшча: прэзідэнта, прэм'ер-міністра і міністра абароны гэтай краіны — за падрыхтоўку акта агрэсіі ў дачыненні да нашай краіны, што парушае рэзалюцыю Генеральнай асамблеі ААН 3314 ад 14 снежня 1974 года, — адзначыў Алег Гайдукевіч. — Ніякіх эмоцый, выключна юрыдычная мова. Мы выдатна бачым на працягу гэтых месяцаў, што шэраг аўтарытэтных, па іх мерках, СМІ адкрыта публікуюць матэрыялы аб фарміраванні на тэрыторыі Польшчы ўзброеных груп, адной з мэт якіх дэкларуецца ўсталяванне кантролю над тэрыторыяй Рэспублікі Беларусь, змена канстытуцыйнага ладу шляхам прымянення ўзброенай сілы. Адпаведныя публікацыі пацвярджаюцца заявамі асоб, якія маюць дачыненне да гэтай дзейнасці, планавання арганізацыйнай і баявой падрыхтоўкі дадзеных узброеных сіл. З адкрытых крыніц вядома, што цэнтры баявой падрыхтоўкі гэтых груп размяшчаюцца ў Польшчы. Баявая падрыхтоўка ажыццяўляецца ваеннымі інструктарамі з Польшчы і ЗША. На тэрыторыі Польшчы згаданыя групы атрымліваюць ваеннае абсталяванне і фінансавую падтрымку».

Гэта акт агрэсіі, адзначыў старшыня ЛДПБ. «Так вызначана міжнароднымі дакументамі. Падрыхтоўка такіх груп — гэта акт агрэсіі ў адносінах да нашай краіны. Таму мы звяртаемся ў Міжнародны крымінальны суд для прыцягнення гэтых асоб да крымінальнай адказнасці. Ніхто ў Польшчы не тое што не спыніе ўсе размовы аб тым, што будзе ўварванне на тэрыторыю Беларусі, тэрарыстычныя акты, а заахвочвае, — падкрэсліў ён. — Яшчэ адзін момант: мы ўказалі гэта ў заяве і юрысты гэта ўсё прапрацавалі. Дзейнасць груп, якія рыхтуюцца цяпер на тэрыторыі Польшчы, немагчымая без прамой падтрымкі вышэйшага кіраўніцтва Польшчы. Гэта выдатна відаць».

«Пачуйце нас, прыміце рашэнне ў адпаведнасці з нашым зваротам і прадухіліце тое, што сёння вы рыхтуеце на тэрыторыі Польшчы. Пяірам гэта ўжо не назавеш, — адзначыў Алег Гайдукевіч. — Калі ў стралковых цірах і на тэрыторыі суседняй краіны ў лясах ідзе адкрытая падрыхтоўка. Мы разумеем выдатна, што да іх потым могуць далучыцца і рэгулярныя часці ўзброеных сіл гэтай краіны. Таму наша заява — гэта яшчэ і для разумення ўсёй Еўропе, што адбываецца на яе тэрыторыі. Час задумацца. Нам канфлікты не патрэбныя. І мэта дадзенага звароту — у тым ліку прадухіліць магчымыя негатыўныя сцэнарыі, якія нехта рыхтуе».

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46. www.ipmtorgi.by** | | |
| **Продавец** | **Частное предприятие «БелСилос», г. Смолевичи, ул. Грушевская, 25** | | |
| **Предмет электронных торгов Местоположение: Минская обл., г. Смолевичи, ул. Грушевская, д. 25** | | | |
| № лота | Наименование (модель) | Шаг торгов | Начальная цена, с НДС 20 % |
| 1 | **Окрасочно-сушильная камера SPRAY BOOTH PRIMA,** 2021 г. в., инв. № 125 | 2 % от текущей цены | 50 000 рублей |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях (BYN) на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **5 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **с 11.00 до 13.00 05.12.2022 г.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **02.12.2022 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06. Email: info@ipmtorgi.by** |

Центр Промышленной Оценки

• **ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
• **ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

## ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | | |
|---|---|---|
| **Организатор электронных торгов** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** | |
| **Продавец** | **РУП «Минскэнерго» филиал «Слуцкие электрические сети», ул. Энергетиков, 1, 223610, г. Слуцк, Минская обл., 801795-61123** | |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by** | |
| **Предмет электронных торгов** | | |
| Лот № | Наименование | Начальная цена, бел. руб., без НДС |
| 1 | **Оперативно-эксплуатационный пункт «Теребуты»** (помещение неустановленного назначения), инв. № 645/D-4343, общ. пл. 55.4 кв. м, расположенный по адресу: Минская обл., Стародорожский р-н, аг. Теребуты, пер. Энергетиков, 1-1 | 6 500,00 |

Шаг электронных торгов составляет 5 % от начальной цены предмета электронных торгов

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390

**Дата и время начала и окончания электронных торгов:**
**с 11.00 до 11.10 18.11.2022 г.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **17.11.2022** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

**Извещение о проведении электронных торгов опубликовано в Аукционы ЕРИ (au.nca.by) от 03.11.2022 г.**

**Контактные телефоны**: +375 (17) 280-36-37; +375 (44) 704-92-06.
**E-mail:** auction@cpo.by

## Частное предприятие «Эволюция бизнеса» проводит открытые торги в форме аукциона по продаже имущества ООО «Ультрафон», находящегося в ликвидации»

Организатор торгов: **частное предприятие «Эволюция бизнеса»** (УНП 191906926), 220081, г. Минск, ул. Михайлашева, 1, пом. 319, тел.: (8017) 374-14-35; (8029) 625 26 71.

Продавец: **ООО «Ультрафон»** (УНП 192399995), ул. Цветочная, 29, оф. 3, 220028, а/г Ждановичи, Минская обл., в лице ликвидатора частного предприятия «Эволюция бизнеса», тел. +375 (29) 625 26 71.

Публичные торги в форме аукциона в ходе ликвидации будут проведены **13 декабря 2022 г. 10.00** по адресу: Минский район, д. Копище, ул. Михайлашева, 1, пом. 319.

Предмет торгов –
единый лот «товарные остатки и материалы» на общую сумму – 70 180 рублей 65 копеек
**(газовое оборудование и комплектующие, дымоходы.**
**Полный список можно запросить у организатора торгов).**

Местонахождение – Минский р-н, д. Боровляны.
Телефон для ознакомления и осмотра +37529 675-58-10.

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 10.11.2022 г. 09.00 по 12.12.2022 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY76 MTBK 3012 0001 0755 0010 6726 в ЗАО «МТБанк», код MTBKBY22, получатель – ООО «Ультрафон».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену за предмет торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» (продавец) в лице ликвидатора ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» – директора ООО «Модель антикризисного управления» Куценковой Н.С. извещает о проведении 16 ноября 2022 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 70 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

**ПОЛНЫЙ и ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА (ЛОТЫ №№ 1–5; 7; 22; 28; 29; 35; 46; 48; 49; 50)**
**размещен на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**
**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 24.09.2021 г. № 184 (29553).**
**ПОЛНЫЙ и ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА (ЛОТЫ №№ 1–5; 8–16; 19, 21, 24–25; 27–30; 32–35; 41–50, 53)**
**размещен на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**
**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 25.01.2022 г. № 15 (29637)**

**Продавец:** Открытое акционерное общество «Жлобинский механический завод «Днепр», ул. Школьная, 8, 247210, г. Жлобин, Гомельская область.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.: **8 (029) 303-53-09, Григорович Павел Карлович.** **Шаг аукционных торгов –** 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в российских рублях (RUB) – ПАО Сбербанк г. Москва, БИК 044525225, к/с 30101810400000000225 в ГУ Банка России по ЦФО, ИНН 7707083893. К/с 30111810800000000154, БИК BLBBBY2X, ОАО «Белинвестбанк», УНП 807000028, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 3 ноября 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 14 ноября 2022 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.**

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с «Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607).

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона, полный список имущества с ценами и размером задатка по лотам размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-53, 8 (029) 651-22-19, 8 (044) 599-18-16.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» (продавец) в лице ликвидатора ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» – директора ООО «Модель антикризисного управления» Куценковой Н.С. извещает о проведении 15 ноября 2022 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 10 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **ПОЛНЫЙ и ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА в количестве 77 единиц оборудования (№№ лотов 8–84) размещен на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы»** | | | |
| **Условие продажи: 1.** Победитель (единственный участник) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** Земельный участок под объекты продажи **(лоты №№ 1–6)** будет выделен по заявке нового собственника согласно законодательству РБ (предварительная схема пользования земельного участка под объекты продажи прилагается). **Информация о земельном участке: лоты №№ 1–6** расположены на земельном участке с кадастровым номером **340800000004000100** общей площадью **8,5646 га (право постоянного пользования). Местоположение (адрес):** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8. **Целевое назначение земельного участка:** для строительства и обслуживания производственных зданий завода (для размещения объектов промышленности) | | | |
| **1** | **Капитальное строение с инв. № 320/С-14071**, площадью **139,2 кв. м**, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **одноэтажное кирпичное здание для хранения легковоспламеняющейся жидкости.** Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8 | **13 320,00** | 1 332,00 |
| **2** | **Капитальное строение с инв. № 320/С-14065**, площадью **1 159,5 кв. м**, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **административно-бытовое здание.** Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8/10. **Ограничение (обременение):** договор об ипотеке (ОАО «Сбер Банк», ОАО «Жлобинский механический завод «ДНЕПР») от 16.11.2015 № 320-00035/15-01 договор о залоге (ипотека) | **297 000,00** | 29 700,00 |
| **3** | **Капитальное строение с инв. № 320/С-14066**, площадью **1 553,2 кв. м**, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **двухэтажное кирпичное административно-бытовое здание с пристройкой.** Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8. **Ограничение (обременение):** договор об ипотеке (ОАО «Белагропромбанк», ОАО «Жлобинский механический завод «ДНЕПР») от 03.12.2012 № 275 договор о залоге (ипотека) | **330 300,00** | 33 030,00 |
| **4** | **Капитальное строение с инв. № 320/С-14068**, площадью **10 036,2 кв. м**, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание цеха новой техники с кирпичной отапливаемой пристройкой для ремонта шаровых кранов.** Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8. **Ограничение (обременение):** договор об ипотеке (ОАО «Белагропромбанк», ОАО «Жлобинский механический завод «ДНЕПР») от 03.12.2012 № 275 договор о залоге (ипотека) | **1 365 300,00** | 136 530,00 |
| **5** | **Капитальное строение с инв. № 320/С-14108**, площадью **12 563,1 кв. м**, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **цех металлоконструкций.** Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8/9. **Ограничение (обременение):** договор об ипотеке (ОАО «Сбер Банк», ОАО «Жлобинский механический завод «ДНЕПР») от 24.02.2016 № 320-00003/16-01 последующий договор об ипотеке, договор об ипотеке от 30.05.2016 № 320-00013/16-01 | **1 622 700,00** | 162 270,00 |
| **6** | **Капитальное строение с инв. № 320/С-37925**, площадью **44,3 кв. м**, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **здание проходной.** В состав лота входят: ворота механические (инв. № 20351), крановая эстакада (инв. № 792). Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8/15 | **182 790,00** | 18 279,00 |
| **7** | Металлический склад для пропана (инв. № 60442), Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8 | **5 490,00** | 549,00 |

**Продавец:** Открытое акционерное общество «Жлобинский механический завод «Днепр», 247210, г. Жлобин, Гомельская область, ул. Школьная, 8. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.: **8 (029) 303-53-09 – Григорович Павел Карлович.**

**Шаг аукционных торгов –** 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в российских рублях (RUB) – ПАО Сбербанк г. Москва, БИК 044525225, к/с 30101810400000000225 в ГУ Банка России по ЦФО, ИНН 7707083893, к/с 30111810800000000154, БИК BLBBBY2X, ОАО «Белинвестбанк», УНП 807000028, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 3 ноября 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 11 ноября 2022 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**.Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с «Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607).

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 24.09.2022 г. № 188 (29810).**

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-53, 8 (029) 651-22-19, 8 (044) 599-18-16.**

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

3 ЛІСТАПАДА 2022 г.
ЧАЦВЕР
№ 18 (15941)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

*Маладыя імёны*

## Аляксей САВІН:

# «АЎТАГОНШЧЫК ПАВІНЕН БЫЦЬ ЦЯРПЛІВЫ І СТРЫМАНЫ»




**Драйв, хуткасць, крутыя павароты, руль у руках і педаль газу — асноўныя кампаненты прафесіі аўтагоншчыка, пра якую марыў у дзяцінстве кожны другі хлапчук. Але як зрабіць, каб тая дзіцячая мара перарасла ў прафесійную дзейнасць і прыносіла не толькі задавальненне, але і развіццё, расказаў нам адзін з найлепшых аўтагоншчыкаў краіны васямнаццацігадовы Аляксей Савін.**

***— Аляксей, як вы сталі аўтагоншчыкам, чаму?***

— Гадоў шэсць-сем таму ў брата быў дзень нараджэння, і мы вырашылі пракаціцца на багі. У мяне неяк адразу пачало гэта атрымлівацца і выклікала цікавасць, таму ўжо на свой дзень нараджэння я вырашыў паўтарыць заезд, але, паколькі багі — зімовы від спорту, мой выбар спыніўся на картынгу. Трэнер, убачыўшы, што ў мяне ўсё атрымліваецца, прапанаваў пайсці ў гэты від спорту, а я пагадзіўся. Уласна той момант і стаў пераломным у маім жыцці і даў пачатак кар'еры аўтагоншчыка. Цяпер адначасова навучаюся ва Універсітэце фізічнай культуры на спецыяльнасці «Менеджмент у спорце».

***— А як паставіліся бацькі да выбару? Усё ж такі гэта дастаткова небяспечны від спорту для падлетка...***

— Станоўча, бо да гэтага я практычна нічым не захапляўся. Хоць было жаданне пачаць іграць на барабанах, нават думаў аб прафесійнай стральбе ў ціры, але тыя пачынанні не ажыццявіліся. І калі ў маё жыццё прыйшоў аўтаспорт, дык бацькі, бачачы, як мне ўсё падабаецца, цалкам мяне падтрымалі. Вядома яны разумеюць, што гэта небяспечны від спорту, але што тут зробіш. *(Смяецца.)* Бацька практычна заўсёды ездзіць са мной на спаборніцтвы, ён у гэтым плане мая абсалютная апора і падтрымка. А мама да гэтага часу калі на гонкі з намі і прыязджае, то стараецца самі заезды не глядзець, стаіць дзе-небудзь убаку, бо ёй страшна за ўсім назіраць, і толькі ў канцы ўжо даведваецца вынікі.

***(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)***

*Трэці працоўны*

# Беларускі «Фенікс» на чарнаморскім узбярэжжы

## Як нашы важатыя скаралі сэрцы расійскіх дзяцей

**«Умей паглядзець на сябе вачыма дзіцяці. Даражы даверам і беражы дзіцячыя тайны. Галоўнай каштоўнасцю для важатага з'яўляецца жыццё дзіцяці. Не дзіця — для важатага, а важаты — для дзіцяці. Не спяшайся абвінавачваць. Умей дараваць чужыя памылкі. Навучыся ўсё бачыць і штосьці не заўважаць. Калі даў слова — трымай. Шчырасць — гэта вартасць важатага. Паважай чужое меркаванне, але памятай пра сваё. Самасцвярджайся толькі за кошт павагі з боку навакольных. Шануй і прытрымлівайся традыцый свайго атрада і паважай традыцыі іншых. Прыслухоўвайся да парад навакольных. Крытыкуеш — прапануй, а прапаноўваючы — дзейнічай. Не ўмееш падпарадкоўвацца — не смей патрабаваць. Не асуджай, а абмяркоўвай. Самаўдасканальвайся і дапамагай іншым гэта рабіць. Не патрабуй ад іншых таго, чаго не можаш зрабіць сам. Паважай у дзіцяці чалавека...» Усяго маральна-этычны кодэкс важатага студэнцкага педагагічнага атрада «Фенікс» імя героя Савецкага Саюза Аляксандра Азончыка ўтрымлівае 28 пунктаў. Атрад быў створаны ў Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П. М. Машэрава два гады таму.**



Фота Лізаветы ГОЛАД.

«Фенікс» і яшэ 20 педатрадаў сталі ўдзельнікамі Рэспубліканскага злёту педагагічных атрадаў, які сабраў пад Мінскам больш за 300 чалавек. Праграма маштабнага форуму была насычана разнапланавымі актыўнасцямі. Старт быў дадзены на плошчы Перамогі ў Мінску. У гэты ж дзень на базе Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта адбылася панэльная дыскусія «Студэнцкія педагагічныя атрады: гісторыя і сучаснасць». Затым байцы педатрадаў раз'ехаліся па сталічных установах сярэдняй адукацыі для ўдзелу ў рэспубліканскім праекце «Школа актыўнага грамадзяніна».

***(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)***

*Проба пяра*

# ПРА ТОЕ, ШТО НАС АБ'ЯДНОЎВАЕ




**«Чырвонка. Чырвоная змена» абвяшчае аб завяршэнні нашага творчага конкурсу «Адзіная краіна — адзіны народ». Сёння мы публікуем апошнюю работу чарговага саіскальніка перамогі.**

Нагадаем, праект быў абвешчаны ў Год гістарычнай памяці сумесна з Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі. У сакавіку маладзёжны дадатак распавёў аб умовах творчага конкурсу для юных і маладых аўтараў, а затым некалькі месяцаў мы змяшчалі на яго старонках найлепшыя, па меркаванні рэдакцыйнага журы, пробы пяра.

Удзельнікам праекта прапаноўвалася выказацца на тэму патрыятызму, захавання гістарычнай памяці, унёску цяперашняга пакалення ў развіццё маладзёжнай палітыкі ў краіне і г. д. Славам, было з чаго выбраць кірунак, чым актыўна і скарысталіся нашы канкурсанты. Падвядзенне вынікаў некалькі зацягнулася, бо, як мы ўжо паведамлялі, многія творчыя работы паступілі ў самы апошні момант да даты прыняцця проб пяра. Але, паверце, яно таго каштавала!

Азнаёміцца і ацаніць творчасць нашых юных і маладых аўтараў можна ў нумарах маладзёжнага дадатку «Чырвонка. Чырвоная змена» за 4 жніўня, 8 і 29 верасня, 13 кастрычніка, а таксама на сайце «Звязды» ў раздзеле «Праекты».

Цяпер жа застаецца толькі паставіць апошнюю кропку — назваць імёны пераможцаў конкурсу. Што мы і зробім у найбліжэйшым выпуску маладзёжнага дадатку «Чырвонка. Чырвоная змена». Пакуль захаваем інтрыгу, але паверце: тых, хто прайграў, дакладна не будзе! У любым выпадку, незалежна ад выбару рэдакцыйнага журы, нашы аўтары атрымалі досвед, парады і падтрымку ад прафесійных журналістаў, а таксама творчыя работы ў асабістыя партфоліа, якія былі апублікаваныя ў рэспубліканскай газеце. Пагадзіцеся, гэта ўжо нямала для цяперашніх школьнікаў, асабліва тых з іх, хто збіраецца абраць прафесію журналіста. Сачыце за вынікамі конкурсу! Усім аўтарам — перамогі!

***(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)***

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
3 11 2022 г.

*Лакацыі актыўнасці*

## НАЙЛЕПШЫЯ ПАЗМАГАЮЦЦА ЗА ТЫТУЛ

**У краіне стартавалі абласныя этапы рэспубліканскага конкурсу «Студэнт года».**

Першай тут стала Віцебшчына. «Студэнта года» выбіралі з дзесяці прэтэндэнтаў з шасці ўніверсітэтаў рэгіёна — тры прадставілі Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава, па два — Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ефрасінні Полацкай і Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт.

Падхопіць эстафету конкурсу 4 лістапада Брэсцкая вобласць. Сталіца збярэ найлепшых студэнтаў горада 8 лістапада. Гомельская вобласць правядзе абласны тур 10 лістапада. Магілёўская і Гродзенская вобласці завершаць вызначаць з выбарам найлепшых студэнтаў 11 лістапада.

Рэспубліканскі конкурс праводзіцца БРСМ пры падтрымцы Міністэрства адукацыі, грамадскіх і творчых арганізацый, СМІ з мэтай падтрымкі студэнтаў, іх сацыяльнага прызнання і прафесійнай рэалізацыі, развіцця творчага патэнцыялу, падтрымкі сацыяльна значнай дзейнасці студэнцкай моладзі, павышэння прэстыжу ведаў і папулярызацыі прафесіі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Пераемнасць пакаленняў*

## АД ГІСТОРЫІ ДА СУЧАСНАСЦІ: КРОЧЫЦЬ НАПЕРАД РАЗАМ

**Моладзь цалкам давярае Беларускаму рэспубліканскаму саюзу моладзі і з задавальненнем падтрымлівае яго праекты і ідэі. Аб гэтым заявіла намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі — начальнік упраўлення па справах моладзі Міністэрства адукацыі Таццяна Сімаіноўская на прэс-канферэнцыі «Камсамол Беларусі: традыцыі і будучыня». Нагадаем, на мінулым тыдні споўнілася 104 гады з дня ўтварэння Усесаюзнага камсамола.**

Паводле слоў Таццяны Сіманоўскай, Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі як правапераемнік камсамола апраўдаў сваю работу і статус маладзёжнай арганізацыі. І тыя праекты, якія рэалізоўваюцца апошнім часам гэтай арганізацыяй, вельмі цікавыя, дастаткова эфектыўныя і абсалютна крэатыўныя. «Гэта дазваляе максімальна ахапіць нашу моладзь, нават тую, якая раўнадушная. Нейкай абавязалаўкі арганізацыя не патрабуе, усе праекты ажыццяўляюцца толькі на добраахвотнай аснове. Гэту традыцыю БРСМ захаваў і з гэтым лозунгам ідзе наперад. Паглядзіце, якія шыкоўныя студэнцкія атрады фарміруюцца ў БРСМ, як актыўна рэалізоўваюцца буйныя рэспубліканскія працоўныя праекты на «Атланце», на МАЗе, гэта значыць, моладзь цалкам давярае арганізацыі і з задавальненнем падтрымлівае праекты і ідэі БРСМ», — падкрэсліла Таццяна Сіманоўская.

Яна адзначыла, што арганізацыя выступае партнёрам Міністэрства адукацыі і дзяржавы ў рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі. «Практычна ніводнае рашэнне, ніводны нарматыўны дакумент мы не прымаем, не абмеркаваўшы яго з нашай моладдзю, з БРСМ. Таму арганізацыя вызначыла сваё месца на маладзёжнай арэне Беларусі. І з дакладна выбудаванымі мэтамі і задачамі БРСМ рухаецца наперад. Мы гатовы падтрымліваць ідэі, праекты і сумесна прымаць кіраўніцкія рашэнні».

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

# Беларускі «Фенікс» на чарнаморскім узбярэжжы

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Адна з інтэрактыўных пляцовак «Выбіраем педатрад!» была арганізавана на базе сталічнай 20-й гімназіі. Гэта месца было абрана для сустрэчы зусім невыпадкова. Справа ў тым, што ў 1990-я гады на базе тады яшчэ 176-й школы ўжо дзейнічалі педагагічныя класы. Пазней тут была ўтворана і дзейнічала некалькі гадоў інфармацыйна-педагагічная гімназія. А ў 2014 годзе менавіта з гэтай установы распачалося адраджэнне ў нашай краіне педагагічных класаў. Сёння 20-я гімназія мае статус школы-лабараторыі вучэбна-навукова-інавацыйнага кластара бесперапыннай педагагічнай адукацыі. 10-я і 11-я гімназічныя класы маюць педагагічную накіраванасць. Прыкладна 80 працэнтаў навучэнцаў педагагічных груп абіраюць пасля заканчэння гімназіі педагагічныя спецыяльнасці. Шмат выпускнікоў вяртаюцца ў педкалектыў ужо ў якасці настаўнікаў. На момант адраджэння педагагічных класаў у калектыве працавалі





дзесяць педагогаў, якія раней скончылі гэту ўстанову. Ёсць такія і сёння...

Цікава, што ў педатрадзе «Фенікс» Віцебскага дзяржуніверсітэта «чыстых педагогаў» зусім няшмат, пра што цяжка здагадацца. Калі яны дзеляцца сваім досведам, у хлопцаў і дзяўчат літаральна гараць вочы... Напрыклад, **Алена ПАЛЕСНІКАВА** — будучы юрыст, навучаецца цяпер у магістратуры. Лічыцца «ветэранам» атрада, бо адпрацавала два летнія працоўныя семестры па чатыры лагерныя змены кожны. **Камандзір атрада Дар'я КАЗАЧЭНКА** і **камісар атрада Кацярына ФОФАНАВА** — будучыя праграмісты, навучаюцца на факультэце матэматыкі і інфармацыйных тэхналогій. Яны ў атрадзе таксама з моманту яго стварэння. Дарэчы, Дар'я ўсяго за адзін працоўны семестр вырасла са статусу выхавальніка-стажора да выхавальніка-настаўніка, даказаўшы ўсім, што не толькі вопытныя важатыя могуць мець такі высокі статус, але і навічок.

Шчыра кажучы, не ўсім даецца шанц папрацаваць у такім месцы, як Усерасійскі дзіцячы цэнтр «Арляня», і правесці лета на марскім узбярэжжы ў Краснадарскім краі. А менавіта там летам 2021 года «Фенікс» атрымаў першае «баявое хрышчэнне». «Арляня» — маштабная тэрыторыя магчымасцяў. За адну змену (21 дзень) яго выхаванцы пражываюць надзвычай насычанае жыццё, успаміны пра якое праносяць праз гады. А цяпер часткай іх успамінаў будуць і важатыя з Беларусі, якія ўжо два гады запар (з сярэдзіны мая і да канца жніўня) арганізоўваюць для іх сапраўдныя святы. Напрамак атрада дзеці выбіраюць самі, у залежнасці ад мэты, з якой едуць у «Арляня». Гэта можа быць, напрыклад, турысцкі атрад, дзе яны спачатку вывучаюць тэорыю, а потым прымяняюць атрыманыя веды і навыкі ў сапраўдным паходзе. Ці творчы напрамак...

— Важатыя ў «Арляняці» — заўсёды надзейная апора. Ён пачынае свой дзень з усмешак дзяцей і заканчвае яго цёплымі дзіцячымі абдымкамі перад сном, — расказваюць пра сябе байцы «Фенікса». — Важаты — той чалавек, які з'яўляецца маральным арыенцірам, ведае адказы на мноства пытанняў ці тое, дзе можна знайсці адказ. І ўвогуле, ён проста сябра, які гатовы дапамагчы, калі штосьці пайшло не так. Важаты не проста вядзе дзяцей з кропкі «А» ў кропку «Б», ён той, хто можа зрабіць згуртаваным атрад, які будзе дзейнічаць як адзін механізм. У гэтым годзе мы працавалі з шостай да дзявятай змены ў лагеры «Камсамольскі». Байкі (матацыклы), танцы, песні, здымкі «Ералаша» — вось што акружала нас на працягу 100 дзён.

— Я, напрыклад, пасля гэтага лета магу даць фору любому аматару матацыклаў, бо правяла тры месяцы ў кампаніі байкераў, якія дзеля забавы збіраюць матацыклы на хуткасць, — усміхаецца Кацярына Фофанава.

«Каця менавіта той чалавек, які можа пачаць смяяцца з нясмешнага жарту і прымусіць смяяцца ўсіх астатніх», — кажуць пра дзяўчыну яе сябры. Дарэчы, за час «цаліны» (на слэнгу студатрадаўцаў гэта месца работы і пражывання атрада. — **Аўт.**) з важатымі адбывалася шмат цікавых гісторый. Напэўна, даволі складана падрыхтавацца да сустрэчы з лунацікам? Адна з важатых сустрэла такое дзіця ноччу і моцна перапужалася, пасля чаго... дзіця прачнулася. Дзеці хавалі ад важатых чыпсы і іншыя забароненыя прадукты. Рабілі «дашырак» з дапамогай гарачай вады з-пад крана...

Сваімі гісторыямі важатыя падзяліліся са старшакласнікамі 20-й гімназіі. Прапанавалі ім стаць байцамі педатрада, паўдзельнічаць у конкурсе і даказаць, што менавіта яны — найлепшыя. Усе гімназісты былі падзелены на групы. Кожная атрымала сваё заданне. Напрыклад, трэба было прадставіць дасягненні беларускіх студэнцкіх атрадаў у крэатыўнай форме, стварыць крэатыўны ролік для TikTok з сімволікай беларускіх студэнцкіх атрадаў, склаці план-сцэнарый святкавання новага года ў атрадзе...

— Адметная рыса студатрада — гэта дружалюбная, а часам нават сямейная абстаноўка, — працягвалі рэкламаваць байцы «Фенікса» студатрадаўскі рух сярод гімназістаў. — Студэнцкія атрады даюць унікальную магчымасць самарэалізавацца і паспрабаваць сябе ў розных напрамках дзейнасці. Вось і мы скарысталіся шанцам, на пэўны час сталі педагогамі. Цяпер, паспрабаваўшы сябе ў ролі выхавальніка, можам сказаць, што выхавальнікам нельга стаць — ім трэба нарадзіцца... Нельга навучыцца аддаваць сябе дзецям, навучыцца прачынацца раніцай дзеля іх. З гэтым трэба нарадзіцца. Гэтым трэба гарэць...

Хлопцы і дзяўчаты канстатуюць, што Рэспубліканскія злёты студатрадаў для кожнага байца — не проста нагода паказаць сябе, але і магчымасць сустрэцца з сябрамі. А для кагосьці яшчэ і нагода атрымаць класны мерч (атрыбутыка і сімволіка студатрадаў — асобная тэма). Зусім хутка ў нашай краіне стартуе патрыятычная акцыя «Зімовы маршрут», арганізатарам якой выступае Рэспубліканскі штаб студэнцкіх атрадаў БРСМ. Шлях байцоў зводных студатрадаў будзе пралягаць праз невялікія гарады і пасёлкі, дзе студэнты арганізуюць шэраг прафарыентацыйных інтэрактываў, тэматычных заняткаў, канцэртных і сацыяльна значных праграм, дапамагаюць у расчыстцы ад снегу помнікаў і абеліскаў, аказваюць шэфскую дапамогу па гаспадарцы ветэранам, удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны і проста адзінокім пажылым.

Байцы «Фенікса» кажуць: «Наш атрад — гэта маленькая сям'я, з якой мы дасягаем агульных мэт, мар і перамог, пераадольваем страхі і перашкоды і становімся лепшымі. Мы шануем кожнага члена нашай каманды, таму імкнёмся клапаціцца адзін пра аднаго. Ва ўсіх важатых існуе павер'е, што жыццё падзяляецца на «да» і «пасля» «Арляняці». Для многіх з нас гэта ўжо не легенда, а праўда жыцця. І нам усім вельмі хочацца зноў туды вярнуцца...»

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

**Аляксандр ПРОХАРАЎ,**
**другі сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ:**

«Гэты год для студатрадаўскага руху склаўся вельмі ўдала. Усяго сёлета ў складзе 441 студэнцкага педатраду былі працаўладкаваны 5667 чалавек. Мы добра папрацавалі, як на тэрыторыі нашай краіны, так і за мяжой — у Расійскай Федэрацыі. Атрымліваем адтуль толькі станоўчыя водгукі аб працы нашых хлопцаў і дзяўчат. Больш за тое, у нас падпісаны пагадненні з Расійскімі студэнцкімі атрадамі, мы абменьваемся вопытам, і на наш форум прыехалі найлепшыя расійскія студатрады. Педагог — не толькі ганаровае званне, але і вялікая адказнасць, бо менавіта ў яго руках самае дарагое — нашы дзеці. І ад таго, якія ўстаноўкі будуць дадзены, якія жыццёвыя арыенціры, духоўна-маральныя каштоўнасці закладваюцца ў маладога чалавека, залежыць будучыня нашай краіны. Рэспубліканскі злёт аб'яднаў найлепшыя студэнцкія педагагічныя атрады краіны. У моладзі гараць вочы, яны чакалі гэты злёт і сур'ёзна да яго рыхтаваліся...»

# БАЧУ МЭТУ — НЕ БАЧУ ПЕРАШКОД,

## або Які ён, рыцар ІТ-фронту

**Як выглядае рыцар XXI стагоддзя? Ён не апрануты ў латы, не трымае ў руках меч ці булаву. Рыцар XXI стагоддзя ўзброены толькі ноўтбукам. Герой маёй гісторыі — праграміст з Мазыра, 16-гадовы Эльдар Мурадаў, які пасягнуў у сваім прафесіяналізме вопытных айцішнікаў. Увіцье: хлопец нават занесены ў Рэспубліканскі банк адоранай моладзі!**

Маё знаёмства з Эльдарам здарылася спантанна і без яго ўдзелу. Як і ўсе мае аднагодкі, я ў планавым парадку праходзіў медагляд у ваенкамаце. Ніякіх думак аб сферы высокіх тэхналогій і блізка не было: галава ж забіта толькі тым, каб хутчэй атрымаць вынік. Чарговы кабінет — на гэты раз правяралі на гатоўнасць да службы маё ментальнае здароўе. Менавіта ў гэтым памяшканні я ўпершыню пачуў пра хлопца, які выдатна разбіраецца ў праграмаванні.

Шчыра зацікавіўшыся, я даволі хутка знайшоў яго і запрасіў на размову. Ужо на наступны дзень дзверы цэнтра творчасці расчыніў Эльдар — аблічча беларускага ІТ. Падцягнуты хлопец у круглых акулярах бадзёра распавядаў аб сваёй працы. Рыхтуйцеся да багацця тэрмінаў, будзем разбірацца.

Эльдар пачаў захапляцца праграмаваннем вельмі рана — ажно з другога класа: «Я хацеў паспрабаваць усё: стаць пажарным, касманаўтам, вайскоўцам. Займаўся нават боксам. Але потым нешта рэзка пстрыкнула, і я ўсвядоміў, што ўмоўным касманаўтам або пажарным стаць не атрымаецца. Шукаючы цікавыя тэмы, я прыйшоў да праграмавання».

З шостага класа простае захапленне кодам перарасло ў нешта сур'ёзнае. «У 11 гадоў вывучаў платформы і мовы для праграмавання. Неяк усё закруцілася, і зараз я Middle.NET інжынер-праграміст», — працягвае размову Эльдар. Для даведкі: у міжнароднай ІТ-сферы, як і ў любой іншай, існуе падзел кваліфікацыі работнікаў. Калі коратка, то Middle — гэта такая ступень прафесіяналізму, калі праграміст здольны самастойна выконваць усе пастаўленыя задачы і спакойна працаваць у камандзе.

Эльдар мае мноства ўзнагарод рэспубліканскага і міжнароднага значэння, звязаных з праграмаваннем. Напрыклад, ён узяў дыплом II ступені на навукова-практычнай канферэнцыі NCTC і дыплом I ступені канферэнцыі ГрДУ імя Янкі Купалы. Хлопец стаў лаўрэатам прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне Computer Science і прэміі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ІТ-«воін» паўтара года займаўся ў школе праграмавання Robocode, вывучаў распрацоўку гульняў з выкладчыкам Сяргеем Васільевічам Краўчуком. Менавіта ў перыяд вучобы Эльдар вырас прафесійна. Сяргей Васільевіч падкрэсліў: «Эльдар — чалавек, які не пасуе з-за цяжкасцяў. «Бачу мэту, не бачу перашкод» — яго дэвіз. У будучыні, без перабольшанняў, Эльдар стане адным з найлепшых праграмістаў Беларусі. Нават зараз яго праекты цягнуць не на рэспубліканскі, а на міжнародны ўзровень».

Я адразу зразумеў: тэрмін «праграміст» — вельмі абстрактны. Эльдар дапамог разабрацца ў пытанні: «Класіфікацыя праграмістаў даволі вялікая. Ты можаш быць, напрыклад, вэб-распрацоўшчыкам, можаш пайсці ў распрацоўку гульняў, штучнага інтэлекту і іншае. Гэта значыць, існуе вельмі шмат напрамкаў і ўсе яны з'яўляюцца праграмаваннем».

Рыцар XXI стагоддзя падзяліўся з намі і сваімі далейшымі планамі: «Паступаць буду ў БДУІР на спецыяльнасць «Інфарматыка і тэхналогіі праграмавання». Цяпер ён вучыцца ў мінскай гімназіі, дзе выкладаюць і дацэнты ФПМІ БДУ.

На пытанне аб неабходнасці вышэйшай адукацыі ці курсаў у ІТ-сферы Эльдар адказаў рашуча: «вышка» абавязковая, калі ёсць магчымасць яе атрымаць. Курсы — не заўсёды панацэя. Справа ў тым, што праграмаванне — цэлая навука: алгарытмізацыя, архітэктура, структуры даных і гэтак далей. Не ведаючы хоць бы адной з гэтых частак, можна сутыкнуцца з цяжкасцямі ў рабоце. Ёсць школы праграмавання, напрыклад Robocode, якія даюць выдатную базу ва ўсіх гэтых напрамках. Аднак табе давядзецца шмат чаго вучыць і самому, а гэтак жа шмат практыкавацца».

Маладыя людзі сапраўды захоплены ІТ-сферай. Каб адказаць на хвалюючыя іх пытанні, мы правялі карысны бліц з нашым суразмоўнікам.



Эльдар такую кнігу «праглынае» за тыдзень!

***— Я часта чую такое сцвярджэнне, што праграмістаў і так шмат, канкурэнцыя высокая і нікуды не прабіцца. Ці гэта так?***

— Ведаеш, на гэта ў мяне ёсць зваротнае сцвярджэнне — чым больш праграмістаў, тым менш праграмістаў. Справа ў тым, што гэтая сфера даволі маладая, вельмі шмат у ёй навічкоў. Сярод сотні знаходзіцца ўсяго адзін дасведчаны праграміст. На фоне гэтай вялізнай масы людзей ён вылучаецца. Для прафесіяналаў багацце людзей — толькі плюс.

***— Праца ў студыі ці дома?***

— У студыі. Калі ў мяне будзе такі выбар, я адназначна абяру студыю. Бракуе стасункаў ужывую з іншымі распрацоўшчыкамі.

***— Ці ёсць у ІТ-сферы такое творчае паняцце, як «натхненне»?***

— Так. Натхненне — вельмі дзіўная штука. Часам ты не можаш заснуць, бо прыйшла новая ідэя. Адразу кажаш сам сабе нешта накшталт: «Я не засну зараз, дзе мой ноўт?», а часам гадзінамі сядзіш і не разумееш, што яшчэ трэба зрабіць. Фантазія ў такія моманты ўвогуле «адпачывае».

***— Што з эмацыянальным выгараннем?***

— Вядома, ёсць, як і ў любой іншай прафесіі. Выгаранне — гэта праблема, якая, магчыма, будзе цябе праследаваць. Таму што ў цябе можа нешта не атрымацца, і ты будзеш вінаваціць сябе ў тым, што ведаеш недастаткова нават у тых момантах, калі проста крыху «затупіў». Гэта толькі адзін з прыкладаў прычын выгарання.

***— Што падабаецца ў працы?***

— Гэта не манатонны занятак. Ты кожны дзень робіш тое, што не рабіў учора (за выключэннем некаторых праектаў). Адзін дасведчаны праграміст сказаў: «Як толькі праца ператвараецца ў руціну, ты пачынаеш яе ненавідзець і выгараць».

***— Дай параду праграмістам-пачаткоўцам.***

— Няма нічога немагчымага. А калі нешта здаецца такім, значыць, ты нешта робіш няправільна.

...Прыемна бачыць, што ў нашай краіне ёсць такія хлопцы, як Эльдар — разумныя, працавітыя і сучасныя. Менавіта яны будуюць нашу светлую сучаснасць і будучыню, паказваюць усяму свету, што Беларусь — гэта краіна для жыцця, краіна высокіх тэхналогій!

**Аляксандр ВЕСЯЛОЎ,**
**вучань 11 класа СШ № 11 г. Мазыра.**

### ПРА АЎТАРА

Аляксандр чацвёрты год займаецца ў клубе «Юны журналіст» Мазырскага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі. Мае вопыт напісання публіцыстычных матэрыялаў для розных газет, часопісаў і інтэрнэт-выданняў. Дарэчы, першым рэспубліканскім выданнем, у якім ён апублікаваўся, была менавіта «Чырвонка. Чырвоная змена».

— Мару аб прафесіі журналіста і планую паступаць у Маскоўскую ВНУ «Вышэйшая Школа Эканомікі». Самай значнай узнагародай у маім партфоліа з'яўляецца дыплом першай ступені Злёту юных журналістаў і блогераў у намінацыі «Друкаваныя СМІ», — падзяліўся 16-гадовы аўтар.

*Крок да прафесіі*

# МЫ ВЫБІРАЕМ ЖУРФАК!



**Сёлета праект «Школа маладога журналіста» на факультэце журналістыкі БДУ сабраў больш за 70 навучэнцаў 8—11 класаў школ, ліцэяў і гімназій з усёй Беларусі.**



Фота з сацыяльнай сеткі «Укантакце».

Госцем першай сустрэчы быў палітычны аглядальнік АНТ Ігар Тур. Ён пагаварыў з абітурыентамі на тэму падрыхтоўкі добрага інтэрв'ю. Журналіст таксама падзяліўся сваімі прыёмамі выхаду са складаных сітуацый, якія здараюцца ў прафесійнай сферы. Акрамя гэтага, мерапрыемства наведалі студэнты-валанцёры, якія ў свой час былі ўдзельнікамі праекта. Яны распавялі аб структуры заняткаў, сістэме балаў, патлумачылі правілы паводзін у аўдыторыі. На сустрэчы абітурыентам было даручана выканаць творчае заданне, якое трапіць у іх партфоліа будучага журналіста. А што думаюць адносна праграмы самі яе ўдзельнікі?

**Валерыя Канцавая, 16-гадовая навучэнка 11 класа з Ашмян,** распавяла, як ёй прыйшла ідэя прыняць удзел у праекце, і падзялілася сваімі ўражаннямі.

— Я зразумела, што дзякуючы «Школе маладога журналіста» ў мяне ёсць магчымасць якасна падрыхтавацца да творчых іспытаў, таму вырашыла скарыстацца гэтым шанцам. Для мяне быць сапраўдным журналістам — значыць захоўваць адданасць справе і любіць сваю работу. Дзякуючы праекту я атрымала шмат новай і патрэбнай інфармацыі, якая будзе карысная пры паступленні і ў далейшым. Кожны раз выходзіла з аўдыторыі са станоўчымі эмоцыямі.

**Ралан Дзядовіч, 17-гадовы студэнт трэцяга курса Гродзенскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа,** распавёў, што аб рабоце журналістам задумаўся ў 8 класе.

— Я ўмею добра гаварыць — з такой якасцю перралік прафесій звужаецца, таму з'явіліся думкі аб журналістыцы. Калі на другім курсе пачаліся прадметы па спецыяльнасці, я зразумеў, што абраная сфера мне нецікавая, і вярнуўся да ідэі аб журфаку. Вырашыў паступаць туды пасля заканчэння каледжа.

**Эмілія Рачыцкая, 17-гадовая навучэнка 11 класа сталічнай школы,** таксама падзялілася сваёй гісторыяй.

— З будучай прафесіяй я вызначылася ў 9 класе. Тады ў верасні да нас у школу прыйшлі прадстаўнікі з Палаца дзяцей і моладзі і паведамілі аб адкрыцці новага гуртка «Журналістыка», які вяла карэспандэнт СТБ, — мяне гэта зацікавіла.

Суразмоўніца распавяла, што ўдзельніцай праекта становіцца ўжо другі раз. Леташні вопыт пакінуў моцнае ўражанне, таму дзяўчына вырашыла зноў акунуцца ў праграму.

— Я канчаткова пераканалася, што хачу паступіць у БДУ, бо там асаблівая атмасфера, адкрытыя, таварыскія, цікавыя людзі.

Для Эміліі, напрыклад, вельмі карысная стала інфармацыя аб тыпах пытанняў пры інтэрв'ю. Дзяўчына зрабіла для сябе памятку і адзначала, што дзякуючы ёй не дапусціць памылак у рабоце ў далейшым.

— У маім разуменні быць сапраўдным журналістам азначае пастаянна развіваць свае навыкі ў падрыхтоўцы матэрыялаў, умець разбірацца ў людзях і іх невербальных жэстах, дапамагаць іншым у вырашэнні праблем. І самае галоўнае — заўсёды прытрымлівацца кодэкса сваёй маралі.

**Лізавета МАЛЬЧУК,**
**студэнтка IV курса факультэта журналістыкі БДУ.**

Стракаты свет

# Новая вяршыня для ціктокераў

**У Казахстане з'явіўся першы TikTok House на дзяржаўнай мове. Для адбору ўдзельнікаў праекта каманда MynBala наведала ўсе рэгіёны краіны і арганізавала кастынг. Усяго было адабрана 20 чалавек, якім цікавыя мастацтва і творчасць. Узрост у іх розны: ад 16 да 22 гадоў.**



Усе яны будуць вучыцца ствараць якасны кантэнт. Гэтыя хлопцы і дзяўчаты — першыя ўдзельнікі праекта MynBala, а TikTok House — арандаваны трохпавярховы катэдж, дзе яны збіраюцца, абмяркоўваюць тэмы, спяваюць і вучацца ў больш дасведчаных членаў каманды.

Трэндавыя танцы, гутарковыя відэа, ліпсінгі — пераважны кантэнт TikTok-блогераў. Але толькі асобныя аматары гэтай сацыяльнай сеткі выпускаюць яго на казахскай мове. Таму асноўная мэта праекта MynBala House — папулярызацыя дзяржаўнай мовы. Моладзь навучаць ствараць якасны кантэнт і здымаць захапляльныя ролікі. За плячыма кожнага ўдзельніка ўжо ёсць блогерскі досвед, хоць і зусім невялікі. Але і гэтага дастаткова, каб дапамагаць адно аднаму знаходзіць новую аўдыторыю. Удзельнікі праекта будуць вучыцца ў вядомых блогераў і мабілографаў.

За месяц існавання праекта на акаўнт MynBala ў TikTok падпісаліся больш за 13,4 тысячы чалавек. Ёсць відэа з 1,3 мільёна праглядаў, а многія ролікі каманды набіраюць дзясяткі тысяч лайкаў.

# Спрыяльныя жыццёвыя планы

**Расійская моладзь назвала найлепшы ўзрост для пачатку кар'еры і нараджэння дзяцей.**

Пачаць зарабляць трэба яшчэ да наступлення паўналецця, з'ехаць ад бацькоў — у 20, завесці дзіця — да 28 гадоў. Узрост для дзяўчыны пры нараджэнні першынца складае 25 гадоў, а ўзрост бацькі — 28 гадоў. Гэта вынікае з даследавання, праведзенага аналітычным цэнтрам Нацыянальнага агенцтва фінансавых даследаванняў. Усяго апытаннем былі ахоплены 1000 чалавек ва ўзросце ад 14 да 35 гадоў.

Для жанчыны аптымальны ўзрост першых родаў знаходзіцца ў інтэрвале ад 21 да 25 гадоў. Так лічаць 55 працэнтаў апытаных. Кожны чацвёрты (26 працэнтаў) выказаў меркаванне, што спрыяльны ўзрост жанчыны пры нараджэнні першынца — ад 26 да 30 гадоў. 15 працэнтаў апытаных выказаліся за тое, што аптымальна рашыцца на нараджэнне дзіцяці трэба ва ўзросце 31—35 гадоў. Найменшая колькасць — тры працэнты — выказалі меркаванне, што жанчыне трэба нарадзіць у 36—40 гадоў.

46 працэнтаў рэспандэнтаў лічаць, што бацькамі трэба стаць у 26—30 гадоў, трэціна (34 працэнты) — ва ўзросце 21—25 гадоў і толькі 12 працэнтаў назвалі ўзрост 31—35 гадоў.

У даследаванні таксама ацэньвалася, які, на думку моладзі, ідэальны ўзрост для пачатку іншых этапаў дарослага жыцця. Большасць маладых расіян лічаць, што юнакі і дзяўчаты павінны зарабіць першыя грошы ў 15—18 гадоў.

На думку большасці маладых (74 працэнты), пачаць асобнае ад бацькоў жыццё як дзяўчаты, так і юнакі павінны да 20 гадоў. Чвэрць апытаных (24 працэнты) лічаць, што пачаць весці самастойнае жыццё дзяўчыне мэтазгодна ва ўзросце 21—25 гадоў, а для пераезду юнака ад бацькоў гэты ўзрост назвалі прыдатным 22 працэнты.

Паводле звестак Міністэрства працы, сярэдні ўзрост нараджэння дзіцяці ў жанчын у Расіі зараз дасягае 28 гадоў.

# Віза таленту для поспеху

**Кваліфікаваныя работнікі і выпускнікі топавых ВНУ зараз змогуць заставацца ў Ганконгу на тэрмін да двух гадоў.**

Кіраўнік адміністрацыі Ганконга Джон Лі абвясціў аб запуску двухгадовай «візы таленту». Яе будуць выдаваць выпускнікам ВНУ з топ-100 міжнародных рэйтынгаў з доследам працы ад трох гадоў. Таксама гэтая віза даступная тым, хто зарабляе 320 тысяч долараў у год і больш.

Пры гэтым уладальнікам «top talent pass» будзе лягчэй уладкавацца на работу. Кампаніі не давядзецца даказваць, што на яго месца не прэтэндуе грамадзянін краіны.

Акрамя таго, выпускнікам ганконгскіх і кітайскіх ВНУ прадоўжылі перыяд знаходжання ў краіне для пошуку працы з аднаго да двух двух гадоў.

Гэтыя меры накіраваны на прыцягненне ў краіну высокакваліфікаваных спецыялістаў і даследчыкаў, каб папоўніць страты з-за «ўцечкі мазгоў».

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

# «АЎТАГОНШЧЫК ПАВІНЕН БЫЦЬ ЦЯРПЛІВЫ І СТРЫМАНЫ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— Памятаеце свае першыя гонкі?***

— Вядома! Гэта быў чэмпіянат Беларусі па картынгу ў Гомелі, мне тады было гадоў трынаццаць. Памятаю, што тады яшчэ пайшоў дождж, а на мокрых трасах мне да таго моманту не даводзілася ездзіць. Гэта быў мой першы вопыт кіравання ў дрэнным надвор'е і адразу на такіх адказных спаборніцтвах. Але вынік мяне вельмі парадаваў: нягледзячы на абставіны, я заняў другое месца. Гэта было вельмі нечакана для ўсіх і, найперш, для мяне. Менавіта ў той момант зразумеў, што гэта ўжо не проста дзіцячае захапленне, што ў мяне ўсё выдатна атрымліваецца, я хачу рухацца далей і надаваць аўтаспорту больш часу, сіл і ўвагі.

***— Картынг для вас быў цяжкім напрамкам аўтаспорту?***

— Не скажу, што ў мяне адразу ўсё пайшло гладка. Наогул, калі я толькі пачаў займацца, у хуткім часе закінуў трэніроўкі на цэлы год. Вярнуўся назад, калі зразумеў, што моцна засумаваў па гэтай справе і набраўся сілы. Усе трэнеры казалі, што замест мяне прыйшоў быццам бы новы чалавек, поўны сіл, імкнення і жадання. У апошні год, калі займаўся картынгам, адзначыў для сябе адну цяжкасць — фізічная сіла. Многія думаюць, што ў гэтым відзе спорту няма нічога складанага, проста націскай на педалі і паварочвай руль, але не, гэта так не працуе. Калі разглядаць картынг як аўтаспорт, а не разавае захапленне, то гэта вельмі вялікія фізічныя нагрузкі.

***— Ці бывалі няўдачы?***

— Якіх-небудзь значных няўдач або правалаў у мяне не было. Былі гонкі, калі прыязджалі і разумелі, што асаблівых вынікаў дасягнуць не атрымаецца, у асноўным гэта еўрапейскія спаборніцтвы, бо там зусім іншы ўзровень падрыхтоўкі пілотаў (так называюць аўтагоншчыкаў), каманд, машын, і нават трасы там іншыя. Быў у маёй кар'еры выпадак, калі я проста з'ехаў з дыстанцыі. Гэта было ў 2019 годзе, я ўжо даязджаў сезон картынгу і быў стапрацэнтным чэмпіёнам, мог нават не даязджаць, але ўсё ж вырашыў гэта зрабіць. Аднак у сярэдзіне гонкі ў мяне нешта адбылося з мышцамі шыі. Працягваць гонку ў такой сітуацыі магло быць небяспечна для жыцця.

***— Вы ж ужо не займаецеся картынгам?***

— Так, цяпер я ўдзельнічаю ў кальцавых гонках. Пераход у гэты напрамак адбыўся ў прамежку паміж 2019-2020 гадамі. Я гартаў «Інстаграм» і ўбачыў у аднаго знаёмага афішу гонак у Расіі на LADA Granta. Гэта называецца кузаўнымі гонкамі, на вялікіх машынах, іх крыху перарабляюць і дапускаюць да заездаў на трасы, якія дасягаюць даўжыні ў пяць кіламетраў. Мяне гэта зацікавіла. У прынцыпе адразу пачало атрымлівацца, мне нават прапанавалі прыняць удзел у чэмпіянаце Расіі па кальцавых гонках, і я пагадзіўся. Першы раз аказаўся сярэднім па выніках, але другая гонка прынесла адразу другое месца, гэта зноў жа многіх прывяло ў шок. Многія спартсмены з пяцігадовым вопытам не маглі дабіцца такіх вынікаў, а ў мяне прайшоў зусім кароткі перыяд і адразу прызавое месца.

***— На момант гэтых гонак вы ж былі яшчэ непаўналетнім...***

— Аўтаспорт зусім няяк не звязаны з паўналеццем або атрыманнем правоў. Нават у «Формуле-1» Макс Ферстапен выступаў у адзінаццаць гадоў. Асноўную базу кіравання мне далі заняткі картынгам. А для спартыўных спаборніцтваў на вялікіх машынах я навучыўся ездзіць гадоў у дванаццаць на трэкавых гонках. Мой трэнер па картынгу стварыў клас «Легенды СССР», там усе ездзяць на «ладах», «пяцёрках», там жа я набіраўся вопыту і нават выступаў.

***— Не думалі вярнуцца назад у картынг?***

— Цяпер я ўдзельнічаю толькі ў кальцавых гонках. Стаў першым у гісторыі беларускага аўтаспорту, хто падпісаў кантракт з камандай Yuka ADV Pro Racing Team. Гэта адбылося даволі спантанна. Мы шукалі якіх-небудзь спонсараў, каб было больш магчымасцяў для майго развіцця як аўтагоншчыка, але не атрымлівалася знайсці, і ў адзін момант яны самі мне патэлефанавалі. Паколькі я не да канца разбіраюся ва ўсіх юрыдычных тонкасцях, папрасіў пагаварыць з імі свайго галоўнага памочніка — бацьку. Пасля іх размовы мы сустрэліся з камандай у Маскве і ўсё ўзгаднілі.





***— Як праходзяць спаборніцтвы і як да іх рыхтуецеся?***

— Як правіла яны адбываюцца на працягу чатырох дзён. Чацвер — афіцыйная трэніроўка, пятніца — трэніроўка і кваліфікацыя: даецца пятнаццаць хвілін, усе машыны аднаго класа ездзяць па трасе, хто хутчэй прыедзе, той «вышэй» стартуе ў гонцы, што дае пэўную перавагу падчас заезду. Трэці дзень — гэта першая гонка, часта нават без трэніровак, а чацвёрты — другая гонка, таму што класаў (катэгорый аўтамабіляў) шмат і ў адзін дзень усе не змяшчаюцца.

***— Якімі якасцямі павінен валодаць чалавек, каб стаць аўтагоншчыкам?***

— У першую чаргу ён павінен быць цярплівым і стрыманым. Бо пасля першай трэніроўкі ты не станеш чэмпіёнам, да ўсяго трэба ісці павольна і паступова, аддаючы сваёй мэце шмат часу, сіл і іншых укладанняў. А стрыманасць спатрэбіцца непасрэдна на саміх гонках. Любы спорт, тым больш аўтаспорт, справа вельмі непрадказальная, ніколі не ведаеш, што можа адбыцца, але ў любой сітуацыі трэба мець халодную галаву і хутка вырашаць праблему. Ну і, натуральна, павінна быць жаданне займацца аўтаспортам, трэба любіць і жыць гэтай справай.

***— Многія называюць вас лепшым аўтагоншчыкам Беларусі, згодны з гэтым выказваннем?***

— Не вельмі прыгожа так пра сябе казаць, але ў цэлым так, згодны. Я пілот універсальны: магу прымаць удзел у гонках на картынгу, на іншых аўтамабілях і на матацыкле, бо ў шаснаццаць гадоў атрымаў правы на яго ваджэнне, мяне нават запрашалі ў мотаспорт. Да таго ж пераможныя вынікі з гонак гавораць самі за сябе. Асабіста я больш за ўсё ганаруся перамогай у картынгу 2016 года ў Латвіі, там я заняў першае месца, таксама лічу важным дасягненнем першае месца ў шостым этапе расійскіх кальцавых гонак, якія праходзілі ў 2020 годзе ў Ніжнім Ноўгарадзе. І, думаю, гэта толькі пачатак.

**Ангеліна НОВІКАВА.**
**Фота дадзены героем.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
E-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 14.804.
Нумар падпісаны ў 19.30 2.11.2022 г.

Организация: **ООО «МОД ХАУС ДЕВЕЛОПМЕНТ»**

Учетный номер плательщика: 193514757
Вид экономической деятельности:
реализация проектов, связанных со строительством зданий
Организационно-правовая форма:
Общество с ограниченной ответственностью

Орган управления:
юридическое лицо без ведомственной подчиненности
Единица измерения: тыс. руб.
Адрес:
220045, г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 127, пом. 488

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 30 сентября 2022 года

| АКТИВЫ | Код строки | На 30 сентября 2022 года | На 31 декабря 2021 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | - | - |
| Нематериальные активы | 120 | 139 | 317 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | - | - |
| в том числе: | | | |
| инвестиционная недвижимость | 131 | - | - |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | - | - |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 38 | 36 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | - | - |
| Отложенные налоговые активы | 160 | 74 | 74 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | 432 | - |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | - | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **683** | **427** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 5 | 4 |
| в том числе: | | | |
| материалы | 211 | 5 | 4 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| незавершенное производство | 213 | - | - |
| готовая продукция и товары | 214 | - | - |
| товары отгруженные | 215 | - | - |
| прочие запасы | 216 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | 6 601 | 4 803 |
| Расходы будущих периодов | 230 | - | - |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 68 | 23 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 11 527 | 12 338 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | 482 | 482 |
| Денежные средства и эквиваленты денежных средств | 270 | 1 | 12 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | - | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **18 684** | **17 662** |
| **БАЛАНС** | **300** | **19 367** | **18 089** |

| СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | Код строки | На 30 сентября 2022 года | На 31 декабря 2021 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 1 | 1 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - | - |
| Резервный капитал | 440 | - | - |
| Добавочный капитал | 450 | - | - |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 1 883 | 1 883 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | 45 | - |
| Целевое финансирование | 480 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **1 929** | **1 884** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 77 | 74 |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | - | - |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | 413 | 408 |
| Доходы будущих периодов | 540 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **490** | **482** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | - | - |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | 13 048 | 13 134 |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 3 900 | 2 589 |
| в том числе: | | - | - |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 1 159 | 47 |
| по авансам полученным | 632 | - | - |
| по налогам и сборам | 633 | 5 | 1 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | - | - |
| по оплате труда | 635 | - | - |
| по лизинговым платежам | 636 | - | - |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | - | - |
| прочим кредиторам | 638 | 2 736 | 2 541 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 650 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **16 948** | **15 723** |
| **БАЛАНС** | **700** | **19 367** | **18 089** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь – сентябрь 2022 года

| Наименование показателей | Код строки | За январь – сентябрь 2022 года | За январь – сентябрь 2021 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | - | - |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | - | - |
| Валовая прибыль | 030 | - | - |
| Управленческие расходы | 040 | - | - |
| Расходы на реализацию | 050 | - | - |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 060 | - | - |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 66 | - |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (37) | (3) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | 29 | (3) |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | - | 1 |
| В том числе: | | | |
| доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | - | - |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | - | - |
| проценты к получению | 103 | - | 1 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | - | - |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | - | - |
| в том числе: | | | |
| расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | - | - |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | - | - |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 276 | 143 |
| в том числе: | | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 248 | 19 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | 28 | 124 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (251) | (206) |
| в том числе: | | | |
| проценты к уплате | 131 | (22) | (17) |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (225) | (4) |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | (4) | (185) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | 140 | 25 | (62) |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 150 | 54 | (65) |
| Налог на прибыль | 160 | (4) | - |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | (5) | 7 |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | - | - |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | - | - |
| Чистая прибыль (убыток) | 210 | 45 | (58) |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | - | - |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | - | - |
| Совокупная прибыль (убыток) | 240 | 45 | (58) |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | - | - |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | - | - |

Руководитель С.П. Ставер
Главный бухгалтер О.Н. Шатерник
24 октября 2022 г.

Организация: **ОДО «ТУТ и ТАМ Логистикс»**

Учетный номер плательщика: 100599687
Вид экономической деятельности: складирование и хранение
Организационно-правовая форма:
Общество с дополнительной ответственностью

Орган управления:
юридическое лицо без ведомственной подчиненности
Единица измерения: тысяч рублей
Адрес: 220075, г. Минск, ул. Селицкого, 21Б, пом. 1, комн. 3

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 30 сентября 2022 года

| АКТИВЫ | Код строки | На 30 сентября 2022 года | На 31 декабря 2021 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 19 500 | 19 021 |
| Нематериальные активы | 120 | 89 | 135 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | - | - |
| в том числе: | | | |
| инвестиционная недвижимость | 131 | - | - |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | - | - |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | - | 881 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 2 736 | - |
| Отложенные налоговые активы | 160 | - | - |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | 1 021 | 3 875 |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | 1 145 | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **24 491** | **23 912** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 340 | 259 |
| в том числе: | | | |
| материалы | 211 | 340 | 259 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| незавершенное производство | 213 | - | - |
| готовая продукция и товары | 214 | - | - |
| товары отгруженные | 215 | - | - |
| прочие запасы | 216 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | - | - |
| Расходы будущих периодов | 230 | 153 | 297 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 824 | 1 047 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 8 642 | 17 581 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | - | - |
| Денежные средства и эквиваленты денежных средств | 270 | 3 | 1 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | - | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **9 962** | **19 185** |
| **БАЛАНС** | **300** | **34 453** | **43 097** |

| СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | Код строки | На 30 сентября 2022 года | На 31 декабря 2021 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 380 | 380 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | | - |
| Резервный капитал | 440 | 7 | 7 |
| Добавочный капитал | 450 | 10 798 | 10 872 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | (3 217) | (3 293) |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | 5 | - |
| Целевое финансирование | 480 | | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **7 973** | **7 966** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 7 814 | 8 774 |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | 2 161 | 3 425 |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | 18 | - |
| Доходы будущих периодов | 540 | 679 | - |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **10 672** | **12 199** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 4 345 | 10 497 |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | 877 | 475 |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 10 586 | 11 231 |
| в том числе: | | - | - |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 5 680 | 4 529 |
| по авансам полученным | 632 | 58 | 275 |
| по налогам и сборам | 633 | 1 427 | 1 710 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 267 | 311 |
| по оплате труда | 635 | 818 | 1 017 |
| по лизинговым платежам | 636 | 2 194 | 3 283 |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | | - |
| прочим кредиторам | 638 | 142 | 106 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | | - |
| Доходы будущих периодов | 650 | | 729 |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **15 808** | **22 932** |
| **БАЛАНС** | **700** | **34 453** | **43 097** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь – сентябрь 2022 года

| Наименование показателей | Код строки | За январь – сентябрь 2022 года | За январь – сентябрь 2021 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 37 167 | 40 700 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (28 721) | (28 587) |
| Валовая прибыль | 030 | 8 446 | 12 113 |
| Управленческие расходы | 040 | (9 687) | (9 315) |
| Расходы на реализацию | 050 | - | - |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 060 | (1 241) | 2 798 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 1 125 | 6 922 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (1 047) | (7 556) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | (1 163) | 2 164 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 901 | 251 |
| В том числе: | | | |
| доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 124 | 3 |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | - | - |
| проценты к получению | 103 | 19 | 24 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности (аренда + эксп.) | 104 | 758 | 224 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (500) | (276) |
| в том числе: | | | |
| расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | (2) | (4) |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности (аренда) | 112 | (498) | (272) |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 5 803 | 1 236 |
| в том числе: | | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 5 803 | 1 236 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | - | - |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (4 915) | (2 801) |
| в том числе: | | | |
| проценты к уплате | 131 | (1 609) | (1 386) |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (2 669) | (881) |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | (637) | (534) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | 140 | 1 289 | (1 590) |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 150 | 126 | 574 |
| Налог на прибыль | 160 | (103) | (11) |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | (18) | - |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | - | - |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | - | - |
| Чистая прибыль (убыток) | 210 | 5 | 563 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | - | - |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | | - |
| Совокупная прибыль (убыток) | 240 | 5 | 563 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | - | - |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | - | - |

Руководитель Р.А. Резанов
Главный бухгалтер О.В. Костылева
26 октября 2022 г.




# «ЁСЦЬ ЧУТКІ, ШТО ЯНУК ЕДЗЕ Ў МАСКВУ. ВОСЬ УЖО ДАСЦЬ ДЫХТУ»

## Што пісалі Якубу Коласу беларускія літаратары

*«І кожны міг сябе я пазнаю часцінкай злітаю вялікага сусьвету»,* — так завяршаў Якуб Колас у 1937-м годзе верш з сімвалічнай назвай «Я жыву».

Сёння мы адзначаем 140-годдзе з дня народзін Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча, які сапраўды жыве сярод свайго народа. Мы працягваем спазнаваць яго творчасць, яго асобу... Зразумець, якім ён быў, дапамагае ліставанне. Эпісталярная спадчына песняра вялікая — ад лістоў да радні да перапіскі як народнага дэпутата... Толькі чалавеку чуламу, які сапраўды многім дапамагаў у бядзе, маглі так раскрываць свае сэрцы. Няхай сёння нейкія штрыхі да асобы Коласа дададуць лісты да яго, напісаныя іншымі пісьменнікамі.



Якуб Колас, Кандрат Крапіва і Міхась Лынькоў.

### «Але што значыць вольным адлегласці і час?»

Хоць абодва нашыя песняры, Купала і Колас, успрымаюцца як вельмі блізкія адзін аднаму і хоць яны сапраўды сябравалі, перапіскі між імі засталося зусім няшмат. Адзін з допісаў Янкі Купалы да Якуба Коласа застаўся толькі дзякуючы памяці сына Коласа Данілы Канстанцінавіча Міцкевіча — той запомніў верш, напісаны Купалам на зваротным баку свайго фотаздымка, дасланага Якубу Коласу з Кіславодска:

*«Шкадую, дружа Колас,*
*што тут цябе няма,*
*Ярчэй свяціла б сонца,*
*мякчэй была б зіма.*
*Дзве тысячы кілометраў*
*сягоння дзеляць нас,*
*Але што значыць вольным*
*адлегласці і час».*

У кароткім прысвячэнні — не толькі шчырая прыязнасць, але і прызнанне, што яны — аднадумцы, творцы, аднолькава вольныя там, куды не могуць дасягнуць ні цэнзары, ні жорсткія абставіны — у небе свайго таленту...

Колас таксама пабывае ў Кіславодску... Вось толькі калі будзе вяртацца адтуль, праз акно яго купэ выцягнуць валізку з рукапісам перапрацаванай на курорце паэмай «Сымон-музыка».

### «Ёй патрэбна даведка, бо дакументаў у яе няма»

Пятрусь Броўка быў у сяброўскіх адносінах і з Купалам, і з Коласам. Адметныя лісты Броўкі да Коласа часоў вайны. 1 верасня 1941-га ён дасылае з Масквы ліст Коласу ў Ташкент, дзе той апынуўся разам з эвакуіраванай беларускай Акадэміяй навук:

*«Дарагі дзядзька Якуб!*

*Прыехаў я ў Маскву з Саратава, а вас ужо няма. Горка мне было, ды нічога не зробіш. Хацелася Вас пабачыць. У Маскве сяджу тры тыдні. Не ведаў, куды ехаць. Учора прыехаў тав. Панамарэнка, і цяпер наша справа вырашаецца. Куды паеду — напішу.*

*Тут было пісьмо ад Юркі. Янка ўзяўся яго адправіць...*

*Лёля паехала да сваіх у Алма-Ату. Будзе там жыць і работаць, а каб паступіць на працу, ёй патрэбна даведка, бо дакументаў у яе няма. Можа б вы напісалі і заверылі ў Саюзе пісьменнікаў свой подпіс-даведку прыблізна такога зместу: «Удостоверяю, что гр. Бровка Елена Михайловна окончила педагогический институт им. Горького в г. Минске и работала мл. научным работником Института литературы и языка Белорусской академии наук. Вице-президент АН БССР, народный поэт Якуб Колас...*

*Прывітанне Вам ад Максіма Танка. Ён тут разам са мною. Часта ўспамінаем Вас добрым беларускім словам».*

У гэтым лісце шмат што трэба тлумачыць. Броўка, якому ўдалося выбрацца з акупаванага Мінска, чакае ў Маскве свайго далейшага прызначэння. А даведка для яго жонкі — справа, за якую не кожны наважыцца ўзяцца. Цесць Броўкі, Міхал Рыдзеўскі, дырэктар Белпедтэхнікума, быў расстраляны як вораг народа ў ноч на 29 кастрычніка 1937 года, цешча з непаўналетнім сынам Алегам адправілася ў лагер. Броўка пасля даб'ецца вызвалення цешчы, але жыць яна ў яго мінскай шыкоўнай кватэры будзе нелегальна. Так што Алена Броўка была не толькі жонкай вядомага паэта, але і дачкой ворага народа, што магло кагосьці ў той неспакойны час насцярожыць.

Юрка, які згадваецца ў лісце, — сярэдні сын Якуба Коласа, які патрапіў на фронт, Янка, які ўзяўся перадаць Юрку ліст, — Купала.

30 верасня 1941 года Пятрусь Броўка дасылае ліст Якубу Коласу ўжо з дзеючай арміі — ён атрымаў прызначэнне ў франтавую газету «За Савецкую Беларусь»:

*«Любы наш дзядзька Якуб!*

*Шлю вам, Мар'і Дзмітраўне, Даніку і Міхасю прывітанне ад усіх хлапцоў, якія кожны дзень у густым сасновым бары ўспамінаюць Вас.*

*Просім мы, каб Вы былі сталым супрацоўнікам нашай роднай газеты «За Савецкую Беларусь». Прысылайце нам усё, што можаце. Нашы сябры, якія дзень і ноч змагаюцца з ворагам на радзіме, прачытаюць і не раз успомняць Вас добрым словам. Ведаючы Вашу акуратнасць, мы спадзяёмся, што хутка атрымаем ад Вас усё, што можна. Напішыце і прозай зварот да беларускіх партызанаў.*

*...Шлём Вам у сонечны Ташкент з асенняга бору самыя найлепшыя пажаданні, а большае за ўсё — радасна сустрэцца на роднай зямлі.*

*Пятрусь».*

У зваротным лісце Колас паслаў Броўку верш «Абаронцам роднай зямлі», яго зварот «На бітву, браты-беларусы» быў надрукаваны 7 лістапада.

З лістоў бачна, як беларускія пісьменнікі ў эпоху, калі яшчэ не існавала ні сотавай сувязі, ні інтэрнэту, намагаюцца ў ваенных віхурах знайсці адзін аднаго, падтрымаць, і цэнтрам такіх сувязяў быў Якуб Колас. 26 снежня 1941-га Броўка паведамляе яму навіны:

*«Дарагі дзядзька Якуб!*

*...Сумная навіна: памёр Змітрок Бядуля ў Уральску ад разрыву сэрца. Бядняга не дачакаўся звароту дахаты.*

*Толькі ўчора знайшоўся Пеця Глебка. Ён працуе ў гор. Саратаве ў рэдакцыі газеты «Чырвонаармеец». Думаю, што яго выклікаюць да нас, і мы будзем разам.*

*Па прапанове т. Панамарэнкі вы ўведзены ў склад нашай рэдкалегіі. Друкуем Вашы вершы. Хутка Вышлем нумары.*

*P. S. Нонік — гад, адпусціў вусы, як сом. А пісаць нікому не хоча».*

«Нонік» — жартоўная мянушка Петруся Глебкі, яго так любоўна звалі ў сям'і.

5 мая 1942 года Броўка напіша Коласу, які засмучаўся, што ніяк не мог знайсці сына: *«паслалі вам тэлеграфам радасную навіну: Юрка знайшоўся. Ён у Калузе ў запасным палку. Пра гэта нам гаварыў Нортман».*

Сцяпан Нортман — беларускі журналіст. Але Колас непакоіцца — чаму ж Юрка нічога не піша сям'і, хоць адрасы ведае, мо Нортман пераблытаў яго з земляком і цёзкам? 16 чэрвеня 1942-га, зноў з Масквы, Броўка чакае новага прызначэння, ён шле Коласу ліст:

*«Я жыву ў казарме, бо кішэня мая ніяк не можа задаволіць гасцініцу. Лынькоў і Крапіва ў «Маскве» па-ранейшаму і ў тых жа самых нумарах.*

*Ганялі мы Нортмана. Ён клянецца, што бачыў Юрку. Папрасілі дакладна ўстанавіць. Я таксама баюся, ці не наблытаў ён. Хацелася б, каб ён бачыў Юрку сапраўды.*

*Ёсць чуткі, што Янук едзе ў Маскву. Вось ужо дасць дыхту. Яшчэ добра, калі без Уладкі».*

Янук, які згадваецца ў лісце, гэта, зразумела. Янка Купала, Уладка — яго жонка, Уладзіслава Францаўна. Меней чым праз два тыдні, 28 чэрвеня, Купала загіне ў лесвічным пралёце гатэля «Масква». Наступны ліст Броўка пашле Коласу толькі ў ліпені:

*«Смерць Янкі так выбіла з раўнавагі, што літаральна не мог узяцца за пяро. Які недарэчны выпадак!»*

Сына Юрку Колас так і не знайшоў... Знік на фронце без вестак. У адным з лістоў паскардзіцца: *«Дзе Сцяпан Нортман? Нашто наблытаў ён мне пра Юрку? Юрка — мая загвоздка, глыбока засеўшая ў маім целе».*

### «Хаджу літаральна як вар'ят...»

Калі Броўка звяртаўся да Коласа папросту, «дзядзька Якуб», Міхась Лынькоў пачынае свае лісты «Дарагі Канстанцін Міхайлавіч!». Лынькоў быў рэдактарам газеты «За Савецкую Беларусь!». 17 жніўня 1941-га ён піша Коласу:

*«За ліст вялікая падзяка. Кожнае роднае слова ўлівае ў нас свежыя сілы. Шмат перажылі мы — і раней, яшчэ разам з Вамі ў родным горадзе — і ў гэтыя дні, але ўсё перажытае мы пастараемся забыць, калі зноў давядзецца апынуцца з Вамі ў родных мясцінах пасля разгрому праклятых гітлераўскіх гадаў. Як хочацца пабыць там, на родных папялішчах. Адно, што турбуе мяне да сённяшняга дня, — не ведаю, ці жывы мой сынок і жонка. Дзе яны, ці выбраліся яны адтуль — не ведаю. Былі чуткі, што яны ішлі пешкі, што іх бачылі ля Дукораў. Вось гэта самае цяжкае, што цісне маё сэрца, не дае супакою».*

Калі пачалася вайна, Лынькоў разам з Купалам і Броўкам былі ў Рызе, на з'ездзе латышскіх пісьменнікаў. З'ехаць удалося з цяжкасцю, на апошнім цягніку-«лятучцы»... З сям'ёй Лынькоў размінуўся, яны засталіся на акупаванай тэрыторыі. І гэта было страшна, бо яго каханая жонка Хана была яўрэйкай, і сын Марык яшчэ малы...

У кастрычніку 1942-га Лынькоў піша Коласу з Масквы, дзе адбываўся з'езд беларускіх партызан:

*«Прыляцелі да нас на мітынг нашы слаўныя лясныя сокалы і адзін з іх — Герой Савецкага Саюза таварыш Казлоў Васіль Іванавіч — перадаў мне такую вестку: «Жыва твая сям'я, не сумуй, мы пастараемся як-небудзь даставіць яе табе». Можаце сабе ўявіць, чым я цяпер жыву і чым дыхаю. Хаджу літаральна як вар'ят, страціўшы ўсякі розум ад радасці. І разам з тым апанаваў мяне страшэнны непакой: сям'я жыве ў акружэнні ворагаў, у пастаяннай небяспецы за жыццё, бо, як сказалі мне, яна хаваецца, відаць, пад чужымі прозвішчамі. У вёсцы, у якой яна жыве, стаіць фашысцкі гарнізон. Частыя вобыскі, арышты, рэпрэсіі і г.д. і да т.п. Гэта раз. Па-другое, калі я падумаю, чым жа яны жывуць там і як жывуць, дык мае сівыя валасы гатовы пазелянець ад тугі і адчаю».*

Аднак эвакуіраваць Хану і Марыка не ўдалося... 16 студзеня 1943 года Броўка піша Коласу: *«аб сям'і маёй пакуль што ніякіх новых чутак не маю. Узрадваўся раз, як ашалелы, і хопіць...»* А 10 ліпеня 1943 года паведамляе:

*«Сёмага гэтага ліпеня атрымаў я ліст з нашай радзімы. Напісала мне родная сястра, настаўніца. Яна цяпер з мужам у адным з партызанскіх атрадаў. З пісьма я даведаўся, што жонка мая з Марыкам жылі ў яе больш года, а потым іх забралі забойцы, якіх парадзіў нямецкі народ, і адвезлі ў бабруйскі лагер. Разам з маёй сям'ёй забралі сям'ю брата Рыгора... Жыў я апошні год цьмянымі спадзяванкамі, па ўсяму бачыў, што яны ператвараюцца ў ілюзіі».*

Вядома, Лынькоў спадзяецца, што родныя нейкім чынам выжылі: *«Астаюцца цуды. Але ж практыка немцаў-дзетазабойцаў гаворыць аб тым, што цудаў не бывае».*

Калі Беларусь вызвалілі, Міхась Лынькоў атрымаў пацверджанне: жонка і сын загінулі ў фашысцкім канцлагеры.

### «Купала быў моцны сваёй тугою па Радзіме, Вы — упэўненай верай у яе»

Пісалі Коласу, вядома, і пачынаючыя паэты, спадзеючыся на падтрымку і блаславенне. У поўным зборы твораў Уладзіміра Караткевіча прыводзяцца два яго лісты да Якуба Коласа, датаваныя 1952 годам. Караткевіч тады быў яшчэ студэнтам Кіеўскага ўніверсітэта. У 1951-м у аршанскай раённай газеце «Ленінскі прызыў» ён дэбютаваў вершам «Якубу Коласу».

У ліпені 1952-га, знаходзячыся на вакацыях у роднай Оршы, Караткевіч паслаў Коласу сшытак са сваімі творамі «Казкі і легенды маёй Радзімы»:

*«Канстанцін Міхайлавіч!*

*Выбачайце за тое, што аднімаю ў Вас каштоўны час. Магчыма, што з гэтай жа справаю я павінны быў звярнуцца ў кабінет маладога аўтара, але тут справа ў тым, што мне трэба не тое, каб заўважылі асобныя недахопы, а каб ацанілі наогул усё. З маленства я звык лічыць Вас прыкладам і таму звяртаюся да Вас і ні да каго больш. Калі знойдзеце магчымым — напішыце мне, ці варта мне прадоўжваць... Адны лаюць, іншыя хваляць, але мне ўсё здаецца, што гэта не тое... Вось толькі што вярнуўся з Вязынкі і зараз шкадую толькі аб тым, што не давядзецца мне быць тут на гадавіну Купалы. У канцы лета паеду на Палессе. Казкі, якія ў сшытку стаяць першымі, не выдуманыя. Я іх толькі вельмі моцна і, здаецца, няўдала абрабіў. Але іншага й нельга было зрабіць, бо першыя дзве казкі чуў я ад свайго дзеда яшчэ да вайны, не памятаў нічога, акрамя сюжэта і асобных выразаў. «Надзвычайную котку», «Мужыка і дзіва» і «Аўтуха-дамоўніка» пашырыў з двух-трох сказаў, «Пятра-разбойніка» пачуў у Рагачове ад рыбака Ганцоўскага, які мне сказаў яе «па случаю» (я яму расказаў «Казку аб двух вялікіх грэшніках» з Някрасава, падобную да гэтай). Казак у мяне ёсць яшчэ з паўсотні, дзясятак песень і іншае. «Вобразы казак» нарадзіліся з павер'яў, асобных фрагментаў казкі. Чаму толькі не намагаюцца фалькларысты запісаць усё гэта? Яно ж перад новымі інтарэсамі адступае.*

*Вершы кепскія, хоць я пісаў спачатку толькі іх. Прыклаў нават два вершы па-руску, гэта з ранніх. «Ваўкалака» — гэта з падання аб разбойніку, які мог перакідацца ваўком і ў якога калісь паны забілі бацьку і матку. Апавяданняў шлю два. Калі ласка, прышліце свой вырак.*

*Яшчэ раз прашу прабачэння.*

*У. Караткевіч».*

Як бачыце, ліст адметны — юны аўтар не лісьлівіць, пры ўсім піетэце не асцярожнічае. Разважае, мысліць... А 3 лістапада ён віншуе Коласа з сямідзесяцігоддзем:

*«...дзякую вам за тое, што Вы існуеце на зямлі, што ў мінуты вялікага шчасця думаеш аб Вас, што ў мінуты, калі вельмі і вельмі цяжка — зноў-такі звяртаешся да Вашых вершаў і паэм, бясконца набіраючы ад іх сілы. Наўрад ці Вы самі ўяўляеце, як уяўляюць гэта Вашы чытачы, што Вы для Беларусі, чым бы мы з'яўляліся без Вас і Купалы. Купала быў моцны сваёй тугою па Радзіме, Вы — упэўненай верай у яе, спакойнаю любоўю да яе...*

*Тое, што Вы пасеялі — не знікне, і людзі, выхаваныя Вамі, цвёрдай хадой пойдуць па гэтым шляху і справы Вашай не згубяць».*

Зерне не знікла, даследчыкі бачаць шмат агульнага ў творчасці Якуба Коласа і Уладзіміра Караткевіча. Прынамсі, імя галоўнага героя трылогіі Коласа «На ростанях» Андрэя Лабановіча невыпадкова стане імем галоўных герояў некалькіх твораў Караткевіча.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

# «МЫ ЎЖО БРАСТАЎЧАНЕ»



З Насцяй на апошнім званку.

## У родным Славянску

...Дома больш няма, замест яго — вялікая варонка з рэшткамі руін. Усё гэта ўжо ў мінулым: адчай, слёзы, разгубленасць, пытанні без адказу: за што і чаму? Яна лічыць, што перажытае варта адпускаць, каб яно не выпальвала душу. Як ні цяжка, трэба перагортваць старонку і жыць далей. Хоць бы дзеля дзяцей. І яна жыве, у Брэсце, ужо сёмы год.

Святлана Даўгаполава пакідае ўражанне чалавека пазітыўнага, нясумнага. Яна верыць, што ўсё будзе добра, верыць актыўна, іншымі словамі, усё робіць дзеля таго, каб было добра. Асабліва цяпер, калі жыццё карэнным чынам памянялася.

Нарадзілася і вырасла яна ў Славянску Данецкай вобласці. Там жа некалі нарадзіліся і яе бацькі, яны карэнныя жыхары 100-тысячнага горада ў некалькіх пакаленнях. Бацькі, расказвала яна, у савецкі час працавалі на вядомым у той час керамічным камбінаце. Ваколіцы яе роднага горада — радовішча знакамітай данецкай блакітнай гліны. Кераміку там рабілі для ўсяго былога Саюза. Пасля развалу вялікай краіны прадпрыемства таксама развалілася. І толькі апошнім часам сталі адраджацца невялікія керамічныя вытворчасці. Традыцыі захавалі, сыравіна ёсць, вось і ўспомнілі дзеці справу бацькоў. Паводле яе назіранняў, з развіццём гэтага дробнага бізнесу горад пачаў ажываць, з'явіліся рабочыя месцы, пайшло паляпшэнне і добраўпарадкаванне тэрыторый.

Па спецыяльнасці Святлана — чыгуначнік. У свой час скончыла чыгуначны тэхнікум, працавала ў вагонным дэпо, выяўляла дэфекты дэталяў і вузлоў вагонаў перад рамонтам. Работа была цікавая, зарплата добрая. Адзінае, што азмрочыла жыццё, — ранні сыход бацькоў. Мама памерла, калі дзяўчыне толькі споўнілася дваццаць, бацька перажыў жонку ўсяго на паўгода. Нібы ратуючыся ад адзіноты і горычы страт, спяшалася стварыць сям'ю, спадзявалася пабудаваць свой маленькі сусвет. Спачатку так і было, потым сямейнае жыццё перастала ладзіцца. Пасля нараджэння трэцяга дзіцяці муж сышоў з сям'і. Засталася адна — тады гэта падавалася найбольшай у свеце праблемай. Не ведала яшчэ: наперадзе чакае такое, што перакрые ўсе ранейшыя беды.

## Прыехалі — а дома няма

— Калі гэта ўсё пачалося ў 2014 годзе, — згадвае Святлана, — была найперш разгубленасць. Ніхто ж не ведаў, як сябе паводзіць, што рабіць. У кіно альбо ў кніжках вайна — гэта адно, а калі побач з табой выбухае, страляе, грукае — зусім іншае. Мы разумелі, што трэба шукаць паратунак, што неабходна некуды ехаць, ісці, уцякаць. І я, і некаторыя суседзі з вуліцы паехалі, дзе бліжэй, у Расію. Мы з дзецьмі некаторы час былі ў Краснадарскім краі. Там нават крыху падпрацоўвала, трэба ж было неяк жыць, карміць дзяцей. Вядома, хацелася дадому. Праз тры месяцы, у сярэдзіне лета, Украіна вярнула кантроль над Славянскам. Знаёмыя і сябры паведамілі, што стала цішэй, бамбёжкі спыніліся. Мы паехалі дадому. Прыехалі — а дома няма...

— Па вуліцы засталося нямала пустых дамоў. Людзі, асабліва тыя, у каго недзе былі сваякі, выехалі, падобна на тое, назаўсёды. З дазволу гаспадароў мы пасяліліся часова ў чужым доме, я выйшла на сваю былую работу. Але ранейшага спакою і бяспекі ў горадзе ўжо не было. Як вам растлумачыць, — задумваецца Святлана. — Звычайнае мірнае жыццё мае перадумовай захаванне базавых правоў, свабод чалавека, ты падсвядома спадзяешся на праваахоўныя органы, на нейкія грамадзянскія інстытуты. Калі ж горад аказваецца ў прыфрантавой паласе, яго кантралююць тыя ці іншыя ваенныя, там дзейнічае права аўтамата. І гэтым усё сказана. Ты жывеш у страху, ніколі не ведаеш, што прыйдзе ў галаву чалавеку са зброяй. Адным словам, усё стала па-іншаму. І я пакутліва шукала выйсце, ды ўсё часцей прыходзіла да высновы, што трэба з'язджаць, ратаваць сябе і дзяцей.

Аўтара гэтых радкоў цікавіла, чаму менавіта Беларусь, можа, раней тут бывала? Аказалася, не. Святлана Даўгаполава да 2015 года ніколі не была ў нашай краіне.

## Апошнім рэйсам — да Баранавіч

— Можна сказаць, тыцнула пальцам у карту, знайшла пункт, — жартуе яна, а потым дадае: — Можа, і не зусім выпадкова. У такой сітуацыі, у якой я была, людзі ператвараюцца ў слых. Любую інфармацыю стараешся атрымаць з першых вуснаў. Гаварыла з многімі людзьмі, хто збіраўся з'язджаць, чые родныя, знаёмыя ўжо з'ехалі. Самыя лепшыя водгукі з усіх бакоў гучалі пра Беларусь. Вядома, лепей было таму, у каго калі не сваяк, то хоць бы знаёмы жыве тут. У мяне такіх не было. Я падышла да вывучэння пытання як чыгуначнік. Глядзела, дзе большыя чыгуначныя вузлы, як дабрацца. На той час хадзіў яшчэ цягнік Харкаў — Баранавічы. Баранавічы ж буйны чыгуначны вузел. Вось і рашыла туды перабірацца. Сабрала чамаданы, па адным на кожнае дзіця, узялі самае неабходнае, дабраліся да Харкава. Як высветлілася, гэта быў адзін з апошніх рэйсаў поезда. Мы ўзялі на яго білеты.

У дарозе пазнаёмілася з жанчынай. Яны з мужам і двума дзецьмі крыху раней выехалі менавіта ў Баранавічы, яна прыязджала адна па рэчы і дакументы. Яны ўжо здымалі кватэру, на першы час нас прытуліў ў сябе. Я стала шукаць работу, жыллё. Не вельмі, праўда, з усім гэтым шанцавала. Нічога ж не ведала спачатку, куды можна звярнуцца, каб хто дапамог. Шукала хоць якія кантакты знаёмых людзей. І выпадкова знайшла адну жанчыну ў Брэсце, яна раней працавала ў нашым вагонным дэпо, тады гэта было павярхоўнае знаёмства, а тут сустрэліся ўжо нібы родныя. Яна і параіла перабірацца ў Брэст, сказала, што ёй дапамаглі ў арганізацыі Чырвонага Крыжа, потым далі інтэрнат. Вось так я і прыехала ў Брэст, — працягвае аповед Святлана.

## Спагада, жыллё, работа

— І праўда, Чырвоны Крыж дапамагаў першы час і з прадуктамі, і з вопраткай для дзяцей. Паступова атрымалі пасведчанне на права жыхарства, статус дадатковай абароны. Усё выглядала важным. Нават простая юрыдычная кансультацыя значыла шмат. Усё роўна, калі прыязджаеш у іншую краіну, не ведаеш многіх нюансаў, напрыклад розніцы ў законах, маеш патрэбу, каб хто падказаў, падтрымаў маральна, — заўважае суразмоўніца.

Паступова жыццё стала наладжвацца. Некалькі месяцаў сям'я здымала кватэру, потым ім далі два пакоі ў інтэрнаце. З работай было больш складана. Але ж жанчына хапалася за любую магчымасць, працавала спачатку пасудамыйкай у медыцынскім каледжы, потым паштальёнам, адміністратарам у філармоніі. Нейкі час ездзіла па прыгарадных гаспадарках, прапаноўвалі работу даяркі, а жыллё не абяцалі. Такі варыянт, вядома, не падыходзіў. Цяпер яна ўладкавалася ў будаўнічай арганізацыі, спадзеючыся на больш высокую зарплату. Але ўжо як атрымалася. За гэтыя гады Святлана навучылася жыць у рэжыме жорсткай эканоміі. Далей — будзе відаць.

Самае важнае, што Святлана Даўгаполава і трое яе дзяцей сёлета атрымалі грамадзянства Беларусі. «Мы ўжо тут канчаткова свае», — кажа шматдзетная маці. Насці, старэйшай, ужо 21 год, яна скончыла школу, цяпер вучыцца ва ўніверсітэце фізічнай культуры. Вучыцца завочна, каб працаваць і аплачваць вучобу. Такое рашэнне было прынята на агульнай іх сямейнай нарадзе. Дзяўчына не пакрыўдзілася, што ёй не выпадае пабыць студэнткай, бо разумее, што маці не выцягне яшчэ і яе вучобу. Галоўнае, што яна ідзе да ўвасаблення сваёй мары стаць трэнерам. Насця скончыла школу алімпійскага рэзерву па акадэмічным веславанні. Цікава, што ўсе дзеці Даўгаполавых вельмі любяць спорт. Шаснаццацігадовая Софія паспяхова займаецца стральбой з лука, таксама сваю будучыню не аддзяляе ад спорту. Дванаццацігадовы Руслан, вучань школы № 10, наведвае лёгкаатлетычны манеж і не прапускае ніводнай трэніроўкі.

## Самая вялікая каштоўнасць

— Мяне ўразіла, — кажа маці сям'і, — што тут ёсць магчымасць дзецям займацца амаль любым відам спорту, прычым бясплатна. У нас такога не было. А яшчэ адразу кідаюцца ў вочы чысціня, парадак, стан дарог, акуратныя палі, якія апрацоўваюцца. У вас пасля савецкага перыяду захавалі калгасы, проста па-іншаму іх назвалі. У нас калектыўнай гаспадаркі больш няма, а прыватныя, як выглядала, апрацоўвалі далёка не ўсю зямлю, таму хапала закінутых, недагледжаных участкаў. У Беларусі ўсё па-іншаму.

— І галоўная каштоўнасць — цішыня і спакой. Памятаеце, як некалі даўно нашы бабулі казалі: галоўнае, каб не было вайны, а мы даволі іранічна, калі не сказаць, паблажліва, як нейкі перажытак мінулага, успрымалі тыя разважанні. Груба кажучы, на сваёй шкуры, сваімі вантробамі давялося зведаць вялікі філасофскі і жыццёвы сэнс тых слоў. Яны рабілі высновы не на пустым месцы, а зыходзячы з перажытага, выпакутаванага жыццёвага вопыту. Цяпер кожны дзень думаеш, толькі б сюды тая вайна не дакацілася, не зачапіла гэты край, які нас прытуліў... — дзеліцца Святлана.

— Мы ўпэўніліся, што людзі тут добрыя, памяркоўныя. Даводзілася не раз сутыкацца са спагадай, разуменнем. Вядома, даволі доўга жыло адчуванне, што ты тут у гасцях, часова, а цяпер часам лаўлю сябе на думцы: «У нас, у Брэсце, лепей». Гэта калі даводзіцца па рабоце бываць на аб'ектах у іншых гарадах. І дзеці, заўважаю, сталі лічыць гэты горад сваім. Дзеці наогул хутчэй прывыкаюць, адаптуюцца. Цяпер, нават калі б прапанавалі лепшую работу ў сэнсе аплаты ў іншай мясцовасці з жыллём, не ведаю, ці рашылася б я ўсё памяняць. Шчыра кажучы, стамілася ад пераездаў, пошукаў. Тут мы ўжо, наколькі магчыма ва ўмовах інтэрната, наладзілі свой быт. Дзяўчаткі ў мяне працавітыя, калі я ў камандзіроўцы, прыгатуюць паўнацэнны абед, не будуць карміць меншага бутэрбродамі альбо сасіскамі. На дні нараджэння кожнага з нас абавязкова пячом усе разам торт, любім сумесныя прагулкі па выхадных. Бываем у самых прыгожых мясцінах горада. Мы ўжо — брастаўчане, — падсумоўвае жанчына.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота з архіва Святланы ДАЎГАПОЛАВАЙ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# БЕЛАРУСКІЯ КНІЖНІКІ — У ТАШКЕНЦЕ

**Прадстаўнічая беларуская дэлегацыя на чале з намеснікам міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Ігарам БУЗОЎСКІМ удзельнічае ў III Ташкенцкай кніжнай міжнароднай выстаўцы-кірмашы, якая распачалася 2 лістапада ў сталіцы Узбекістана.**

З прывітальным словам да сяброў — пісьменнікаў, выдаўцоў, журналістаў, паліграфістаў з сонечнай краіны — звярнуўся і старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь Карлюкевіч. Вось што гаворыцца ў прывітанні: «Літаратура, кніга заўсёды былі трывалым грунтам нацыянальнай культуры і сродкам міжнацыянальных стасункаў, адной з невычэрпных крыніц мудрасці, духоўнасці і самасвядомасці народаў, магутным сродкам фарміравання асобы грамадзяніна і патрыёта...»

У апошнія гады даволі прадукцыйна развіваюцца беларуска-ўзбекскія гуманітарныя, літаратурныя сувязі. У Мінску пабывалі старшыня Саюза пісьменнікаў Узбекістана, паэт Сіражыдзін Саід, празаік, перакладчыца Рысалат Хайдарава, празаік, драматург і публіцыст Кучкор Наркабіл, іншыя майстры слова, перакладчыкі.

У Ташкенце і сёння трымаюць у памяці повязь з Узбекістанам у ваенныя гады народнага песняра Беларусі Якуба Коласа, якога гасцінная ўзбекская зямля прыняла ў эвакуацыю з першых месяцаў Вялікай Айчыннай. Зусім нядаўна Выдавецкі дом «Звязда» выпусціў кнігу «Табой я жыў, табой жыву...»: пра жонку Якуба Коласа». На старонках выдання, прысвечанага Марыі Дзмітрыеўне Міцкевіч (Каменскай), шмат добрых слоў пра Ташкент, Узбекістан, узбекскіх літаратараў. У кнізе згадваюцца ташкенцкія знаёмыя сям'і Коласа — акадэмік Акадэміі навук Армянскай ССР Эзрас Асрацян, старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета Узбекскай ССР Юлдаш Ахунбаеў, член-карэспандэнт АН СССР Аляксандр Горынаў, узбекскі паэт Гафур Гулям, расійскі вучоны-хімік Ісак Казарноўскі, украінскі вучоны-хімік Юрый Ліпатаў, беларускі гісторык Уладзімір Пічэта...

У апошні час на старонках беларускіх перыядычных выданняў з'явіліся публікацыі твораў узбекскіх паэтаў у перакладзе на беларускую мову — Эркіна Вахідава, Алішэра Наваі, Сіражыдзіна Саіда, Кучкора Наркабіла.

**Кастусь ЛЕШНІЦА.**

# Да юбілею класіка



**Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне памятны спецштэмпель, які будзе выкарыстоўвацца 3 лістапада 2022 года для правядзення спецыяльнага памятнага гашэння, прымеркаванага да 140-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа.**

Мерапрыемства адбудзецца на Мінскім паштамце, дызайн спецштэмпеля — Алены Мядзведзь. Да гэтай падзеі РУП «Белпошта» падрыхтавала мастацкі маркіраваны канверт з літарнай маркай «А» (канверт таксама прысвечаны творчасці Янкі Купалы, памятны спецштэмпель быў выпушчаны 7 ліпеня 2022 года).

Намінал маркі «А» адпавядае тарыфу на перасылку простага ліста масай да 20 грамаў уключна ў межах Рэспублікі Беларусь.

Праект падрыхтаваны ў супрацоўніцтве з Дзяржаўным літаратурным музеем Янкі Купалы і Дзяржаўным літаратурнамемарыяльным музеем Якуба Коласа.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703** |
| Продавец | **ОАО завод «ВИЗАС», 210602, г. Витебск, пр-т Фрунзе, 83** |

**Оборудование, бывшее в употреблении, расположенное по адресу: г. Витебск, пр-т Фрунзе, 83**

| № лот | Инв. номер | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| | | **Перечень 1 (снижение начальной стоимости на 65 %)** | | |
| 1 | 1022 | Станок внутришлифовальный VOUMARD VI | 4032,00 | 201,60 |
| 2 | 1085 | Станок внутришлифовальный 3А227С116 | 3192,00 | 159,60 |
| 3 | 1125 | Станок центрошлифовальный SIXb160x1 | 4872,00 | 243,60 |
| 4 | 981 | Станок внутришлифовальный 3А227 | 2856,00 | 142,80 |
| 5 | 1144 | Станок резьбошлифовальный 5822 | 2940,00 | 147,00 |
| 6 | 1782 | Станок резьбошлифовальный 5822М | 3150,00 | 157,50 |
| 7 | 2146 | Станок резьбошлифовальный 5822М | 3150,00 | 157,50 |
| 8 | 1149 | Станок круглошлифовальный с ЧПУ 3А151 | 2142,00 | 107,10 |
| 9 | 1233 | Станок круглошлифовальный 3А130 | 2268,00 | 113,40 |
| 10 | 1895 | Станок радиально-сверлильный 2М55 | 3360,00 | 168,00 |
| 11 | 2124 | Станок радиально-сверлильный 2Н53 | 3864,00 | 193,20 |
| 12 | 1131 | Станок вертикально-сверлильный 2А125 | 1386,00 | 69,30 |
| 13 | 1203 | Станок вертикально-сверлильный 2Н125 | 1470,00 | 73,50 |
| 14 | 1340 | Станок вертикально-сверлильный 2Н125-2 | 2394,00 | 119,70 |
| 15 | 1430 | Станок вертикально-сверлильный 2Н125-4 | 4830,00 | 241,50 |
| 16 | 1592 | Станок вертикально-сверлильный 2Н125 | 1470,00 | 73,50 |
| 17 | 1688 | Станок вертикально-сверлильный 2Н135 | 2184,00 | 109,20 |
| 18 | 1777 | Станок вертикально-сверлильный 2Н135 | 2184,00 | 109,20 |
| 19 | 2031 | Станок вертикально-сверлильный 2Н125 | 1470,00 | 73,50 |
| 20 | 2033 | Станок вертикально-сверлильный 2Н125 | 1470,00 | 73,50 |
| 21 | 2310 | Станок вертикально-сверлильный 2Н125 | 1470,00 | 73,50 |
| 22 | 1475 | Пресс гидравлический листоштамповочный П6324 | 2562,00 | 128,10 |
| 23 | 878 | Пресс гидравлический листоштамповочный РУЕ-25 | 2310,00 | 115,50 |
| 24 | 2107 | Пресс гидравлический листоштамповочный П6320 | 2226,00 | 111,30 |
| 25 | 511 | Ножницы комбинированные Н-514 | 2226,00 | 111,30 |
| 26 | 823 | Ножницы комбинированные Н-514 | 2226,00 | 111,30 |
| 27 | 2754 | Ножницы гильотинные НК-3414 | 2646,00 | 132,30 |
| 28 | 2843 | Пресс-ножницы НВ1429 | 2226,00 | 111,30 |
| 29 | 1989 | Станок фуговальный СФА-4 | 2016,00 | 100,80 |
| 30 | 239 | Станок строгальный по дереву 350 мм | 882,00 | 44,10 |
| 31 | 2900 | Станок торцешлифовальный | 252,00 | 12,60 |
| 32 | 2914 | Станок деревообрабатывающий ВЗ-356 | 1218,00 | 60,90 |
| 33 | 2922 | Станок деревообрабатывающий ВЗ-356 | 1218,00 | 60,90 |
| 34 | 2923 | Станок деревообрабатывающий ВЗ-368 | 1218,00 | 60,90 |
| 35 | 3524 | Устройство для отсоса стружки ВЗ-382 | 92,40 | 4,62 |
| 36 | 444 | Станок вертикально-сверлильный 2А135 | 1596,00 | 79,80 |
| 37 | 51 | Станок рейсмусовый деревообрабатывающий | 1470,00 | 73,50 |
| 38 | 912 | Пила циркуляционная | 462,00 | 23,10 |
| 39 | 695 | Станок токарный по дереву ТВ200М | 1596,00 | 79,80 |
| 40 | 2506 | Циркулярная пила ЦП | 462,00 | 23,10 |
| 41 | 2702 | Станок фуговальный СФ6-1 | 1764,00 | 88,20 |
| 42 | 3022 | Станок круглопильный ВЗ-349 | 1344,00 | 67,20 |
| 43 | 3000 | Станок деревообрабатывающий Ц2Д-5А21 | 3696,00 | 184,80 |
| 44 | 3798 | Станок пильно-брусующий ВЗ-369 | 7518,00 | 375,90 |
| 45 | 3799 | Станок деревообрабатывающий ВЗ-325 | 6972,00 | 348,60 |
| 46 | 872 | Циркулярная пила ЦП | 462,00 | 23,10 |
| 47 | 1065 | Станок вертикально-сверлильный 2Н135 | 2310,00 | 115,50 |
| 48 | 1448 | Кран консольный 0,25 т | 966,00 | 48,30 |
| 49 | 3692 | Система вентиляции | 8652,00 | 432,60 |
| 50 | 1059 | Машина бумагорезальная ЗБР-70 | 1764,00 | 88,20 |
| 51 | 2809 | Станок вертикально-сверлильный 2С132 | 2436,00 | 121,80 |
| 52 | 104 | Станок шпонко-фрезерный HURT | 2352,00 | 117,60 |
| 53 | 1626 | Станок горизонтально-фрезерный 6Р82Г | 2562,00 | 128,10 |
| 54 | 1868 | Станок широкоуниверсальный фрезерный 675 | 2058,00 | 102,90 |
| 55 | 2077 | Станок горизонтально-фрезерный 6Р80Г | 3066,00 | 153,30 |
| 56 | 2315 | Станок горизонтально-фрезерный 6Р80Г | 3066,00 | 153,30 |
| 57 | 2152 | Станок шпонко-фрезерный 692Р | 3108,00 | 155,40 |
| 58 | 625 | Станок шпонко-фрезерный 692А | 3108,00 | 155,40 |
| 59 | 2871 | Станок горизонтально-фрезерный 6Т82-29 | 5628,00 | 281,40 |
| 60 | 1224 | Станок шпонко-фрезерный 692М | 3108,00 | 155,40 |
| 61 | 2873 | Станок вертикально-фрезерный 6Т12Ф20-28 | 4788,00 | 239,40 |
| 62 | 2859 | Станок вертикально-фрезерный 6Т82 | 5628,00 | 281,40 |
| 63 | 1912 | Станок горизонтально-фрезерный 6Р83 | 5250,00 | 262,50 |
| 64 | 1928 | Станок горизонтально-фрезерный 6Р82 | 2562,00 | 128,10 |
| 65 | 2014 | Станок вертикально-фрезерный 6Р13 | 4620,00 | 231,00 |
| 66 | 2876 | Станок радиально-сверлильный ГС501 | 5040,00 | 252,00 |
| 67 | 1178 | Станок шпонко-фрезерный 692М | 3108,00 | 155,40 |
| 68 | 2446 | Станок токарный с ЧПУ DF2/CNC | 5418,00 | 270,90 |
| 69 | 1481 | Станок плоскошлифовальный 3Б722 | 3990,00 | 199,50 |
| 70 | 2392 | Станок отрезной | 1470,00 | 73,50 |
| 71 | 2920 | Станок отрезной ООС | 1470,00 | 73,50 |
| 72 | 1855 | Станок плоскошлифовальный ОЩ-48 | 3108,00 | 155,40 |
| 73 | 1778 | Станок плоскошлифовальный 3Г71 | 2982,00 | 149,10 |
| 74 | 2158 | Станок плоскошлифовальный 3Б722 | 3990,00 | 199,50 |
| 75 | 2721 | Станок плоскошлифовальный 3Е711В | 4284,00 | 214,20 |
| 76 | 1140 | Станок плоскошлифовальный 3Б722 | 3990,00 | 199,50 |
| 77 | 2657 | Станок продольно-шлифовальный Sz11-12-03 | 30744,00 | 1537,20 |
| 78 | 2719 | Станок резьбошлифовальный 5Д822ВМ | 3066,00 | 153,30 |
| 79 | 2771 | Токарный с ЧПУ DF2/3CNC | 5166,00 | 258,30 |
| 80 | 435 | Зубодолбежный вертикальный полуавтомат 514 | 2562,00 | 128,10 |
| 81 | 52 | Зубодолбежный полуавтоматический станок ВСН-150NC22-3064 | 84840,00 | 4242,00 |
| 82 | 492 | Зубошевенговальный станок 5714 | 1512,00 | 75,60 |
| 83 | 1562 | Колодец охлаждения корзины | 361,20 | 18,06 |
| 84 | 1379 | Электропечь У60А | 1974,00 | 98,70 |
| 85 | 2410 | Станок внутришлифовальный СШ141С23 | 3360,00 | 168,00 |
| 86 | 1549 | Станок круглошлифовальный 3Б151П | 2226,00 | 111,30 |
| 87 | 1245 | Станок координатно-расточной 2А4450 | 7644,00 | 382,20 |
| 88 | 60 | Станок точильно-шлифовальный Вз 879-02 | 966,00 | 48,30 |
| 89 | 61 | Станок точильно-шлифовальный Вз 879-02 | 1008,00 | 50,40 |
| 90 | 942 | Станок настольно-сверлильный 2М112 | 386,40 | 19,32 |
| 91 | 5045 | Станок настольно-сверлильный 2М112 | 386,40 | 19,32 |
| 92 | 219 | Шаборовочная плита, размер 1000х1600 | 1512,00 | 75,60 |
| 93 | 2102 | Станок плоскошлифовальный 3Б722 | 2940,00 | 147,00 |
| 94 | 2036 | Станок универсальнозаточной 3М642Е | 11130,00 | 556,50 |
| 95 | 2493 | Станок универсальнозаточной 3Е642Е | 11130,00 | 556,50 |
| 96 | 2538 | Станок универсальнозаточной 3Е642Е-01 | 11130,00 | 556,50 |
| 97 | 2887 | Станок специально-заточной ВЗ-318 | 9912,00 | 495,60 |
| 98 | 2925 | Станок заточной ВЗ-318Е | 12390,00 | 619,50 |
| 99 | 3008 | Станок универсальнозаточной 3Е642Е | 11130,00 | 556,50 |
| | | **Перечень 2 (снижение начальной стоимости на 30 %)** | | |
| 100 | 1787 | Кран консольный к/к 0,25т | 1 344,00 | 67,20 |
| 101 | 1853 | Кран консольный к/к 1,00т | 3 780,00 | 189,00 |
| 102 | 1880 | Монорельс с электроталью груз. 0,5 т | 1 008,00 | 50,40 |
| 103 | 2056 | Монорельс м/р 0,5т | 1 092,00 | 54,60 |
| 104 | 2182 | Кран-балка к/б 1т | 1 512,00 | 75,60 |
| 105 | 2712 | Монорельс 0,25т | 117,60 | 5,88 |
| 106 | 2775 | Кран консольный к/к 0,50т | 1 260,00 | 63,00 |
| 107 | 5080 | Станок заточной С/И 10МА-411 | 411,60 | 20,58 |
| 108 | 644 | Установка аккумуляторная для зарядки эл-кары | 260,40 | 13,02 |
| 109 | 106 | ЛИТФОРМА 1835-4029 ТИП 20 | 4 788,00 | 239,40 |
| 110 | 1067 | Станок токарно-револьверный 1341 | 1 092,00 | 54,60 |
| 111 | 1127 | Станок универсально-заточной GALP | 4 284,00 | 214,20 |
| 112 | 1147 | Станок круглошлифовальный 3А130 | 2 604,00 | 130,20 |
| 113 | 1167 | Станок токарно-револьверный 1341 | 2 184,00 | 109,20 |
| 114 | 1170 | Станок вертикально-сверлильный 2Н125 | 2 016,00 | 100,80 |
| 115 | 1202 | Монорельс на гальванические линии | 109,20 | 5,46 |
| 116 | 1210 | Станок горизонтально-протяжной 7Б510 | 10 920,00 | 546,00 |
| 117 | 1216 | Станок токарно-револьверный 1Н1341 | 1 428,00 | 71,40 |
| 118 | 123 | Станок токарно-затыловочный МИЧИГАН | 4 872,00 | 243,60 |
| 119 | 1318 | Кран консольный к/к 0,25т | 596,40 | 29,82 |
| 120 | 1342 | Станок круглошлифовальный 1052 | 5 964,00 | 298,20 |
| 121 | 1382 | Станок универсально-заточной GAP | 11 508,00 | 575,40 |
| 122 | 1417 | Наждачное точило | 243,60 | 12,18 |
| 123 | 1624 | Консольный кран 0,40т | 2 856,00 | 142,80 |
| 124 | 1625 | Консольный кран 0,40т | 3 276,00 | 163,80 |
| 125 | 2035 | Станок токарно-револьверный 1Г325 | 1 344,00 | 67,20 |
| 126 | 2079 | Станок широкоуниверсальный фрезерный 675М | 1 176,00 | 58,80 |
| 127 | 2121 | Станок лектроимпульсный 4Б724 | 1 512,00 | 75,60 |
| 128 | 2159 | Станок токарно-затыловочный DH250 | 19 320,00 | 966,00 |
| 129 | 2425 | Станок электроэрозионный 4532-Ф3 | 7 056,00 | 352,80 |
| 130 | 2491 | Монорельс 0,25т | 210,00 | 10,50 |
| 131 | 2555 | Галтовочный барабан 10МА | 5 544,00 | 277,20 |
| 132 | 2785 | Галтовочный барабан 41114-1 | 1 428,00 | 71,40 |
| 133 | 2829 | Станок вертикально-сверлильный 2С132 | 3 528,00 | 176,40 |
| 134 | 2892 | Швейная машина ПШМ КЛ.550 | 285,60 | 14,28 |
| 135 | 2895 | Швейная машина ПШМ КЛ.1022М | 285,60 | 14,28 |
| 136 | 2897 | Электронная раскройная машина ЭЗМ4-160 | 193,20 | 9,66 |
| 137 | 2927 | Полуавтомат специально-заточной для дисков пил ВЗ-330 | 29 652,00 | 1 482,60 |
| 138 | 2978 | Моечная машина мод.030696 | 2 352,00 | 117,60 |
| 139 | 332 | Точильно-шлифовальный станок, модель ВЗ-879-02 | 806,40 | 40,32 |
| 140 | 3676 | Система прецизионной лазерной маркировки | 103 320,00 | 5 166,00 |
| 141 | 3698 | Модернизация вальцев резинообр. ЛБ-200 100/100 | 51 492,00 | 2 574,60 |
| 142 | 5034 | Настольно-сверлильный станок 2М112 | 394,80 | 19,74 |
| 143 | 5076 | Станок для обечаек 10МА-264 | 3 024,00 | 151,20 |
| 144 | 318 | Оптическая делительная головка ОДГ-10 | 924,00 | 46,20 |
| 145 | 3009 | Воздухонагреватель ВГС-1 и его составляющие | 46 956,00 | 2 347,80 |
| 146 | 3010 | Воздухонагреватель ВГС-1 и его составляющие | 46 956,00 | 2 347,80 |
| 147 | 3011 | Воздухонагреватель ВГС-1-01 и его составляющие | 48 468,00 | 2 423,40 |
| 148 | 3012 | Воздухонагреватель ВГС-1-01 и его составляющие | 48 468,00 | 2 423,40 |
| 149 | 3013 | Воздухонагреватель ВГС-1-01 и его составляющие | 48 468,00 | 2 423,40 |
| 150 | 3014 | Воздухонагреватель ВГС-1-01 и его составляющие | 48 468,00 | 2 423,40 |
| 151 | 3015 | Воздухонагреватель ВГС-1-01 и его составляющие | 48 468,00 | 2 423,40 |
| 152 | 1319 | Кран консольный к/к 0,25т | 1 344,00 | 67,20 |
| 153 | 1358 | Станок координатно-расточной BKZ900x14* | 213 360,00 | 10 668,00 |
| 154 | 1412 | Станок алмазно-расточной 2А78 | 4 200,00 | 210,00 |
| 155 | 1535 | Тележка передаточная гр.5т С4171.05 | 554,40 | 27,72 |
| 156 | 1630 | Консольный кран 0,40т | 3 024,00 | 151,20 |
| 157 | 1637 | Консольный кран 0,25т | 1 680,00 | 84,00 |
| 158 | 1800 | Кран консольный к/к 0,50т | 2 940,00 | 147,00 |
| 159 | 1898 | Кран консольный к/к 1,00т | 3 108,00 | 155,40 |
| 160 | 2026 | Кран консольный к/к 1,00т | 3 108,00 | 155,40 |
| 161 | 2027 | Кран консольный к/к 1,00т | 1 680,00 | 84,00 |
| 162 | 2052 | Станок радиально-сверлильный 2М55 | 3 360,00 | 168,00 |
| 163 | 2128 | Кран консольный к/к 1,00т | 3 108,00 | 155,40 |
| 164 | 2293 | Кран консольный к/к 0,63т | 4 704,00 | 235,20 |
| 165 | 2295 | Станок координатно-сверлильный с ЧПУ VR-5M-2295 | 601 440,00 | 30 072,00 |
| 166 | 2652 | Станок координатно-расточной WKW-100 | 34 104,00 | 1 705,20 |
| 167 | 2709 | Кран консольный к/к 0,50т | 3 108,00 | 155,40 |
| 168 | 2710 | Кран консольный к/к 0,50т | 3 192,00 | 159,60 |
| 169 | 2774 | Кран консольный к/к 1,00т | 1 764,00 | 88,20 |
| 170 | 2821 | Кран консольный к/к 0,50т | 2 856,00 | 142,80 |
| 171 | 3553 | Станок точильно-шлифовальный ВЗ-379-01 | 672,00 | 33,60 |
| 172 | 3706 | Станок заточной для дисковых пил ВЗ-464 | 1 428,00 | 71,40 |
| 173 | 3797 | Мод-я станка для деревообр. инструмента ТЧП-4 | 35 028,00 | 1 751,40 |
| 174 | 4014 | Наждачное точило | 445,20 | 22,26 |
| 175 | 689 | Станок точильно-шлифовальный ВЗ-879-02 | 495,60 | 24,78 |
| 176 | 903 | Станок точильно-шлифовальный ВЗ-879-02 | 1 260,00 | 63,00 |
| 177 | 970 | Станок универсально-заточной С-40 | 6 720,00 | 336,00 |
| 178 | 1080 | Станок плоскошлифовальный SS-40Е | 18 480,00 | 924,00 |
| 179 | 1298 | Станок настольно-сверлильный станок НС-12А | 302,40 | 15,12 |
| 180 | 1321 | Кран консольный к/к 0,25 т | 1 092,00 | 54,60 |
| 181 | 1353 | Станок настольно-сверлильный станок НС-12 | 470,40 | 23,52 |
| 182 | 2043 | Станок плоскошлифовальный 3Г71М | 5 124,00 | 256,20 |
| 183 | 2071 | Станок вертикально-сверлильный 2Н125 | 730,80 | 36,54 |
| 184 | 2296 | Пресс гидравлический листоштамп. П6316 | 2 772,00 | 138,60 |
| 185 | 2312 | Пресс гидравлический листоштамп. П6316 | 2 772,00 | 138,60 |
| 186 | 2567 | Станок радиально-сверлильный 2К52-1 | 5 544,00 | 277,20 |
| 187 | 2756 | Станок радиально-сверлильный 2К52-1 | 5 544,00 | 277,20 |
| 188 | 3801 | Стенд для испытания БИД (модернизация) | 50 736,00 | 2 536,80 |
| 189 | 3803 | Стенд для обкатки СДО-2 | 6 636,00 | 331,80 |
| 190 | 3807 | Полуавтомат для заточки зуборезных головок ВЗ-685Ф2 | 638 400,00 | 31 920,00 |
| 191 | 5029 | Станок настольно-сверлильный станок 2М112 | 201,60 | 10,08 |
| 192 | 988 | Станок плоскошлифовальный 3Г71 | 1 512,00 | 75,60 |
| 193 | 1163 | Пресс гидравлический листоштамп. П437 | 6 300,00 | 315,00 |
| 194 | 2513 | Трубогиб 1404 | 579,60 | 28,98 |
| 195 | 2723 | Станок вертикально-сверлильный 2Г125 | 1 596,00 | 79,80 |
| 196 | 2830 | Станок вертикально-сверлильный 2С132 | 3 528,00 | 176,40 |
| 197 | 2901 | Станок для заточки инструмента 10МА | 1 008,00 | 50,40 |
| 198 | 7278 | Бетономешалка | 319,20 | 15,96 |
| 199 | | Микроавтобус-вагон ГАЗ 322132, рег. знак АА 6459-2, кузов № Х9632213260503375, 2006 г.в. | 2 856,00 | 142,80 |
| | | **Перечень 3** | | |
| 200 | 200/С-39241 | **Административно-бытовой корпус** (здание административно-хозяйственное), общей площадью 5 109 кв. м. Составные части и принадлежности: 2 перехода | 283 800,00 (снижение 50 %) | 14 190,00 |

**Сведения о земельном участке с кадастровым номером 240100000001005466:** предоставлен на праве аренды (доля 999/1000) общей площадью 10,4867 га для содержания и обслуживания административно-производственных зданий и сооружений

**Оборудование, бывшее в употреблении, расположенное по адресу: г. Витебск, пр-т Фрунзе, 83**

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 201 | 1609 | Установка для заточки инструмента 10МА411 | 636,00 | 31,80 |
| 202 | 684 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 203 | 685 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 204 | 2575 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 205 | 2576 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 206 | 686 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 207 | 727 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 208 | 739 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 209 | 11 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 210 | 13 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 211 | 14 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 212 | 15 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 213 | 16 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 214 | 17 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 215 | 18 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 216 | 52 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 217 | 53 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 218 | 54 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 219 | 55 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 220 | 56 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 221 | 57 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 222 | 58 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 223 | 59 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 224 | 60 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 225 | 61 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 226 | 62 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 227 | 63 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 228 | 64 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 229 | 65 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 230 | 66 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 231 | 67 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 232 | 68 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 233 | 743 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 234 | 2591 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 235 | 2595 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 236 | 790 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 237 | 825 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 238 | 834 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 239 | 2191 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 240 | 826 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 241 | 2165 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 242 | 2167 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 243 | 2168 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 244 | 2169 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 245 | 2170 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 246 | 2171 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 247 | 2172 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 248 | 835 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 249 | 2193 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 250 | 2199 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 251 | 2200 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 252 | 2201 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 253 | 370 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 254 | 377 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 255 | 763 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 256 | 659 | Верстак слесарный | 180,00 | 9,00 |
| 257 | 782 | Верстак | 180,00 | 9,00 |
